Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

7 САКАВІКА 2009 г.
СУБОТА
№ 43
(26401)

Кошт 600 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

## Дзякуй за цеплыню вашых рук!

*Дарагія суайчынніцы!*

*Сардэчна віншую вас з цудоўным вясновым святам — Днём жанчын.*

*Вы з гонарам і годнасцю выконваеце святую місію, ускладзеную на вашы кволыя плечы, — аберагаеце сямейны ачаг, прыўносіце любоў і радасць у гэты свет.*

*Сучасныя жанчыны з высокім прафесіяналізмам, актыўным удзелам у палітычным, эканамічным, сацыяльным і культурным жыцці краіны смела бяруць на сябе адказнасць за сучаснасць і будучыню Беларусі.*

*Дзяржава высока цэніць ролю жанчын-маці, якія выхоўваюць падрастаючае пакаленне і клапоцяцца аб дзецях.*

*Упэўнены, што вы, дочкі роднай беларускай зямлі, заўсёды будзеце прыкладам патрыятызму, працавітасці і вернасці грамадзянскаму абавязку.*

*Дарагія жанчыны! Нізкі паклон вам за мудрасць і душэўную шчодрасць. Дзякуй за цеплыню вашых рук і ззянне вачэй.*

*Няхай ваш дом будзе напоўнены ўтульнасцю і гармоніяй, а сэрца сагрэта цяплом, клопатам і ўвагай родных і блізкіх!*

*Здароўя, бадзёрасці духу, удачы і шчасця.*

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА**

## Чарговае пасяджэнне Грамадска-кансультатыўнага савета пры Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі запланавана на 31 сакавіка

**У адпаведнасці з прынятымі 6 лютага на першым, арганізацыйным, пасяджэнні Грамадска-кансультатыўнага савета пры Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі рашэннямі праводзіцца падрыхтоўка да чарговага пасяджэння савета, якое папярэдне намечана на 31 сакавіка.**

Як і было вызначана на арганізацыйным савеце, наступнае пасяджэнне пройдзе па тэме «Выпрацоўка новых падыходаў у рэалізацыі стратэгіі эканамічнага развіцця краіны, у тым ліку ў перыяд сусветнага фінансавага крызісу». Вызначаны склад рабочай групы з ліку членаў савета для падрыхтоўкі названай тэмы, праведзена папярэдняе ўзгадненне прамоўцаў, сумесна з імі намечаны пэўныя пытанні для абмеркавання. Акрамя таго, у адпаведнасці з прынятымі на арганізацыйным савеце рашэннямі, яго членам накіраваны праект рэгламента Грамадска-кансультатыўнага савета пры Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі, а таксама даведнік з тэлефонамі і электроннымі адрасамі ўсіх членаў савета.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

Антыкрызісная эканоміка

## МАСАВЫХ СКАРАЧЭННЯЎ НЯМА, АЛЕ ПАМЕНШЫЛАСЯ КОЛЬКАСЦЬ ВАКАНСІЙ

**Рынак працоўнай сілы Магілёўскай вобласці застаецца даволі стабільным. Пра гэта паведамілі спецыялісты Камітэта па працы і сацыяльнай абароне аблвыканкама.**

Праца — гэта галоўны здабытак і каштоўнасць чалавека, асабліва ў цяперашні час негатыўных наступстваў сусветнага крызісу. Калі ёсць праца, будзе і заробак, сродкі для існавання сям'і і гадавання дзяцей. Усе змены ў сферы вытворчасці адлюстроўваюцца на рынку працы. Таму весткі пра звальненні, зазначым — пераважна на прадпрыемствах у замежжы, усё ж трывожаць і нас.

— Статыстыка за першыя два сёлетнія месяцы сведчыць, што ў нас падстаў для вялікіх хваляванняў няма, — паведаміў **начальнік упраўлення занятасці насельніцтва Уладзімір ШАПЯЛЕВІЧ.** — Сітуацыя адсочваецца штотыдзень і застаецца падкантрольнай. І хаця, натуральна, крызіс нас не абміне зусім, але тут **становуча адбіваецца даручэнне кіраўніцтва дзяржавы найперш захаваць працоўныя калектывы.**

Усё сапраўды выглядае нядрэнна. У студзені з арганізацый Магілёўскай вобласці звольнілі 7,1 тысячы чалавек, і гэта нават меней за мінулагодні паказчык: у першы месяц дабрабытнага 2008 года было звольнена 7,7 тысячы чалавек. Пераважная большасць звольненых сёлета пайшлі з працы па ўласным жаданні і па пагадненні бакоў, і толькі 131 чалавек — з прычыны скарачэння колькасці работнікаў і штатаў.

У студзені-лютым статус беспрацоўнага атрымалі 5,1 тыс. чалавек. Гэта таксама менш, чым у адпаведным перыядзе мінулага года. Масавага прытоку беспрацоўных няма, ва ўсякім разе — пакуль. **Узровень беспрацоўя цяпер складае 1%:** ён павялічыўся ад мінулагодняга на некалькі дзесятых працэнта.

*(Заканчэнне на 2-й стар.)*

# САМАЕ САЛОДКАЕ СВЯТА!



*Дырэктар Лепельскага хлебазавода Віктар АЎДЗЕЕНКА ўпэўнены, што з тартамі, выпрацаванымі на яго прадпрыемстве, кожны святочны стол 8 Сакавіка будзе па-сапраўднаму прыгожым і смачным.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## «Са святам вас, мілыя жанчыны! Любіце мужчын, нам так гэтага не хапае!»

**Напярэдадні Міжнароднага жаночага дня віншаванні чытачкам «Звязды» ад мінчан.**

**Аляксандр КУЛАКОЎ, выкладчык БНТУ:**



— Мілым жанчынам хачу пажадаць здароўя, кахання і шчасця. Я ўвогуле супраць таго, каб віншаваць жанчын толькі адзін дзень. Гэта несур'ёзна, калі жаночы дзень адзін раз у годзе. Трэба заўжды, калі ёсць настрой і магчымасць, рабіць падарункі, радаваць сваіх жанчын.

Лепшы падарунак, на мой погляд, гэта кветкі ў гаршках, таму што так сумна глядзець, калі зрэзаныя жывыя вянуць. Сваіх супрацоўніц, а іх на нашай кафедры дзесяць, мы ўжо павіншавалі і словамі, і кветкамі.

**Юра і Віталік, студэнты факультэта транспартных камунікацый БНТУ:**



— Дарагія жанчыны, заставайцеся такімі, якія вы ёсць зараз: мілымі, прыгожымі. Усяго вам самага светлага, чыстага.

— Таксама, як Віталік!))) Любіце нас! Мужчынам так гэтага не хапае!

Усім жанчынам патрэбна ўвага. Напрыклад, падысці да матулі і сказаць: «Мама, я цябе люблю!». Галоўнае, падарыць незвычайны падарунак, магчыма, афрыканскую кветку ці нейкі букет засушаны. Мы, як мужчыны XXI стагоддзя, вырашылі, што ў жаночы дзень нам не хапае весялосці. Таму вырашылі схадзіць з дзяўчатамі на КВЗ і купілі пяць білетаў.

**Арцём, студэнт:**



— Для мяне гэтае свята не такое ўжо і свята, як, у прынцыпе, і 23 лютага. Не ведаю, магчыма, гэты дзень і павінен быць, але віншаваць сваіх жанчын патрэбна не толькі адзін раз у год. Калі ўжо малады чалавек шчыра кахае сваю дзяўчыну, то ён будзе праяўляць увагу не толькі раз у год, а нашмат часцей. У дзяцінстве гэтае свята адчувалася больш. А цяпер я нават не ведаю, навошта сцяжкі павесілі.

**Юры, мужчына сярэдніх гадоў:**



— Мы зараз вось будзем віншаваць нашых супрацоўніц. Дарагія, мілыя, цудоўныя жанчыны, віншую вас з 8 Сакавіка! Жадаю шчасця, кахання, каб мужчыны больш звярталі на вас увагу. Насамрэч 8 Сакавіка — вялікае, выдатнае свята. Звычайна ў гэты дзень мы, мужчыны, любім, цалуем, дорым кветкі сваім любым жанчынам.

**Аляксандр, працаўнік камерцыйнай арганізацыі:**



— Гэта адно з самых цёплых і светлых святаў напярэдадні вясны. Мілым жанчынам хачу пажадаць болей усміхацца, не сумаваць, а таксама добрага настрою. Каб ён асацыяваўся ў вас не толькі з гэтым святам, але быў такім на працягу года. Звычайныя падарункі ў гэты дзень — кветкі, як бачыце. А таксама ўвага, усмешкі.

**Віншаванні перадала Настасся ЗАНЬКО, фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.**

### Новыя жылыя дамы абсталююць электроннымі лічыльнікамі электраэнергіі

Да канца гэтага года ў Мінску і Мінскай вобласці колькасць электронных лічыльнікаў электраэнергіі ў жылых дамах дасягне 10 % ад агульнай колькасці прыбораў.

Гэтыя лічыльнікі даюць больш дакладныя паказанні, яны абаронены ад замаху зламыснікаў. Паўплываць на дакладнасць звестак такіх прыбораў практычна немагчыма. А наяўнасць унутры лічыльнікаў пароля і звестак пра спажыўца робіць спробы іх крадзяжу бессэнсоўнымі.

**Магда КРЭПАК, «Мінск—Навіны».**

Урокі дыпламатыі

## ДЗВЕ ЖАНЧЫНЫ Ў АДНОЙ ЛОДЦЫ, або Як прыручыць уласную нявестку?

**Калі я толькі пачала сустракацца са сваёй будучай «палавінай», мяне не вельмі цікавіў статус яго бацькоў... Але нашы адносіны развіваліся імкліва і за вельмі кароткі тэрмін з ружова-летуценных ператварыліся ва ўстойліва-трывалыя. І тады я вырашыла спытаць — так, на ўсялякі выпадак — чым займаецца яго мама... Пачуўшы адказ, мякка кажучы, зніякавела. Аказалася, што Марыя Іосіфаўна Карпенка не толькі ўзначальвае жаночы часопіс «Работніца і сялянка» (цяпер «Алеся») і займае пасаду сакратара Беларускага саюза журналістаў. Яна — вядомы ў рэспубліцы грамадскі дзеяч, член прэзідыума Камітэта савецкіх жанчын, заслужаны работнік культуры, народны дэпутат СССР і г.д., і да т.п.**

**Словам, «рэгалій» у будучай свекрыві было столькі, што яна падалася мне кімсьці накшталт небажыхара, на якога можна хіба што любавацца здалёк, ні ў якім разе не набліжаючыся і не назаляючы яму сваёй прысутнасцю... І калі аднойчы сям'я будучага мужа запрасіла мяне, тады яшчэ «зялёную» студэнтку журфака, да сябе ў госці, мне зрабілася амаль што млосна... Як цяпер памятаю: вялікая зала, сервіраваны па ўсіх правілах свецкіх прыёмаў стол, на сцяне — партрэт будучай свекрыві ў чырвонай сукенцы з томікам Ахматавай у руках... Са мной міла і вельмі прыязна павіталіся, запрасілі за стол, дзе сядзелі яшчэ некалькі гасцей, і... пакінулі на саму сябе. Шчыра кажучы, я ўздыхнула з палёгкай.**

**Марыя Іосіфаўна ў святочнай сукенцы і павязаным зверху фартушку бегала з залы на кухню і назад — падавала гарачае і халоднае, закускі і бутэлькі... Калі надышоў час знаёміць прысутных, яна прыабняла мяне за плечы: «А гэта наша Наташа...» І лёд у нашых адносінах не толькі крануўся, але і растаў...**

**З таго часу мінула чвэрць стагоддзя — чым не нагода, каб узяць інтэрв'ю ў жанчыны, з якой мы кожную раніцу «перасякаемся» на агульнай кухні? Як, уласна кажучы, ёй удаецца вытрымліваць наша такое блізкае суседства, пры любой сітуацыі застаючыся на вышыні, захоўваючы пачуццё гумару і такту? У рэшце рэшт, чыя гэта заслуга — яе ці мая?**

*(Заканчэнне на 3-й стар.)*

# МЫ РАДЫ ЗА ВАС!

## Тэлевізар і пыласосы ад «Звязды» — у надзейныя рукі

Чарговы выезд звяздоўскага дэсанта, які ў перыяд падпіснай кампаніі становіцца, лічы, абавязковым кожны тыдзень, па вялікім рахунку быў прымеркаваны на Магілёўшчыну ў Чэрыкаў, дзе свой каляровы тэлевізар чакала наша падпісчыца са стажам Людміла Аляксандраўна Ананіч. Праўда, ехаць за край свету толькі ў адзін раён — недазвольная раскоша. У выніку маршрут вяжу быў складзены па карце, дзе нашы больш дробныя прызы чакалі звяздоўцы ў многіх кропках Мінскай і Магілёўскай абласцей.

Першым «удар» нашай газеты прыняў раённы вузел паштовай сувязі з Беразіно. Начальнік РВПС Аляксандр Іванавіч Аляшкевіч не хаваў радасці. Як-ніяк, а паштальён АПС № 1 г. Беразіно Святлана Цішкевіч па выніках рэкламнай гульні «Прыз — рупліваму паштальёну» чакала пыласос. Святлана Уладзіміраўна ў кампаніі сваіх калег шчыра прызналася, што арганізуючы падпіску на «Звязду», не ставіла сабе мэтай выйграць каштоўны прыз, хоць ён і не пашкодзіць у гаспадарцы. Проста ёй «Звязда» падабаецца, і яна з задавальненнем раіць яе выпісаць усім.

*(Заканчэнне на 5-й стар.)*



*Начальнік Бярэзінскага РВПС Аляксандр АЛЯШКЕВІЧ уручае звяздоўскі прыз — пыласос «Самсунг» — паштальёну Святлане ЦІШКЕВІЧ.*

# ПАМІЖ НАМІ, ЖАНЧЫНАМІ

**Напярэдадні свята за адным сталом сабраліся дыпламат і рэжысёр, палітык і артыст, фізік і памежнік, суддзя і журналіст. Аднак якое б прызванне імі не было абранае, найперш яны жанчыны: успрымальныя, эмацыянальныя, чуллівыя. Таму «круглы стол» для жанчын і пра жанчын атрымаўся не па-каляндарнаму цёплым і светлым. Святочны настрой прыемна дапоўнілі кветкі і шчодрыя падарункі. Прыгажосць, як заўжды, — у дэталях. Арганізатары, здаецца, паклапаціліся пра кожную дробязь — пачынаючы ад урачыстай сустрэчы гасцей і заканчваючы танальнасцю гутаркі. Удзельніц віталі пад гукі акардэона і прапаноўвалі выцягнуць з мініяцюрнага кошыка па пралесцы-пытанню: вытанчана аформленыя афарызмы пра жанчын прапаноўваліся для каментарыяў. Абмяркоўваючы іх, госці неўпрыкмет для саміх сябе раскрываліся перад суразмоўцамі, як першыя вясновыя кветкі. Заставалася толькі занатоўваць, і вось якія «пралескі» атрымаліся ў нас.**

***Рыма ФІЛІПЧЫК, суддзя Вярхоўнага Суда: «Пачуццёвасць уласцівая толькі суддзям-жанчынам»***

— Калі вывучаеш справу, дай Божа, каб хапіла сілы, мудрасці і ўменне прымяніць правільна закон. Я разглядаю грамадзянскія справы, гэта заўсёды два бакі, і ты павінен паставіць кропку ў іх спрэчцы. Мара ў мяне — ніколі не памыліцца. Калі разглядаеш справу, адчуваеш, што ў табе павінна быць тая дабрыня, якая ўласціва толькі жанчынам... Тая пяшчотнасць, цеплыня і дабрыня, тая пачуццёвасць, мне так падаецца, уласцівыя толькі суддзям-жанчынам.

***Ганна ЛАЎРУКЕВІЧ, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па працы, сацыяльнай абароне, справах ветэранаў і інвалідаў: «Жанчыны ў парламенце нічым не адрозніваюцца ад мужчын».***

— Ці лёгка быць дзелавой жанчынай? У мяне атрымліваецца... На кожнай новай пасадзе мне наноў даводзілася даказваць сваю вартасць. Гэтага можна дасягнуць толькі сваёй працай, каб мужчыны прызналі, што жанчына на сваім месцы... У акругах працаваць і лёгка (таму што абралі ў большасці сваёй людзей, якіх ведаюць, і ты выбаршчыкаў ведаеш, ведаеш патрэбы рэгіёна), і цяжка (таму што ўсе патрэбы задаволіць немагчыма — недастаткова фінансавых сродкаў). Самае галоўнае — дэпутаты павінны зрабіць усе захады, каб сацыяльная накіраванасць нашага бюджэту не пацярпела. Жанчыны ў парламенце нічым не адрозніваюцца ад мужчын.

*(Заканчэнне на 2-й стар.)*



## ЗАСТАВАЙЦЕСЯ СА «ЗВЯЗДОЙ»

**Пачалася падпіска на II квартал 2009 года**

Падпісныя цэны на газету «Звязда» (у рублях)

| Індэкс | на 1 месяц | на 3 месяцы |
|---|---|---|
| 63850 (індывідуальны) | 10120 | 30360 |
| 63145 (індывідуальны льготны для пенсіянераў, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны) | 9570 | 28710 |
| 63858 (ведамасны) | 16170 | 48510 |
| 63239 (ведамасны льготны для ўстаноў міністэрстваў культуры, адукацыі і аховы здароўя) | 14740 | 44220 |



## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### БЕСПРАЦОЎЕ Ў ЗША ДАСЯГНУЛА МАКСІМУМУ ЗА ЧВЭРЦЬ СТАГОДДЗЯ



**Узровень беспрацоўя ў ЗША ў лютым 2009 года перасёк адзнаку ў 8 % і дасягнуў максімальнага ўзроўню са снежня 1983 года. Пра гэта паведамляе Bloomberg.**

Паводле афіцыйнай статыстыкі, колькасць працоўных месцаў у ЗША скарацілася на 651 тысячу ў лютым і на 655 тысяч у студзені. Са снежня 2007 года, калі ЗША афіцыйна ўступілі ў стадыю рэцэсіі, у краіне стала на 4,4 мільёна працоўных месцаў менш.

### БРЫТАНІЯ КІШЫЦЬ ШПІЁНАМІ З РАСІІ?

**Расія «заваліла» Вялікабрытанію сваімі шпіёнамі. Паводле даклада брытанскага Камітэта па разведцы і бяспецы, рэсурсаў, якія вылучаюцца на барацьбу з імі, не хапае. Контрразведка літаральна збіваецца з ног, піша The Daily Mail.**

Узровень недаверу паміж краінамі прымушае экспертаў казаць аб вяртанні да халоднай вайны. Магчымасці MI-5 на мяжы, заявіў напярэдадні кіраўнік Камітэта па разведцы і бяспецы Джонатан Эванс. Шпіянажам Лондану дапякаюць рускія і кітайцы.

### У ФРАНЦЫІ ЗАБАРАНІЛІ БЯСПЛАТНУЮ І ТАННУЮ ВЫПІЎКУ

**Ніжняя палата французскага парламента, Нацыянальная асамблея, у пятніцу прыняла закон, які забараняе танны і бясплатны алкаголь, паведамляе Le Parisien.**



Гаворка ідзе аб так званых open bars, у тым ліку рэкламных кампаніях або акцыях па прасоўванні новага прадукту, калі кліенты могуць спрабаваць алкаголь бясплатна або за сімвалічную плату.

Аўтары закона адзначаюць, што ён накіраваны, у першую чаргу, на барацьбу з алкагалізмам сярод моладзі. Закон павінен перашкодзіць маладым людзям хутка і танна напівацца.

### МУЖЧЫНЫ ЛЯГЧЭЙ ПАДДАЮЦЦА КРЫЗІСНАЙ ДЭПРЭСІІ

**Жанчыны перажываюць фінансавы крызіс лягчэй, чым мужчыны, высветлілі вучоныя з Кембрыджскага ўніверсітэта.**

Як растлумачыў у інтэрв'ю The Financial Times кіраўнік даследавання Брэндан Барчэл, гэта тлумачыцца распаўсюджаным уяўленнем пра мужчыну як пра «здабытчыка», з-за якога яму складаней жыць з думкамі пра магчымае звальненне і, калі спатрэбіцца, перажыць страту працы. Таксама высветлілася, што звольненыя работнікі пачынаюць вяртацца ў нармальны стан пасля паўгода адаптацыі, у той час як душэўнае здароўе тых, хто жыве пад страхам звальнення, пастаянна пагаршаецца на працягу 1-2 гадоў. Варта адзначыць, у сувязі з крызісам у шматлікіх краінах свету рэзка вырасла колькасць самагубстваў. Медыкі і эксперты ў галіне псіхалогіі прадракаюць рэкордны ўзровень суіцыду ў 2009 годзе.

# ТЭРМІН КАРЫСТАННЯ ЖЫЛЛЁВЫМІ КРЭДЫТАМІ ДЛЯ «ЧАРГАВІКОЎ» ПЛАНУЮЦЬ ПАВЯЛІЧЫЦЬ ДА 30 ГАДОЎ

**За апошнія 7—8 месяцаў кошт жылля, што будуецца з дзяржаўнай падтрымкай, даволі істотна павялічыўся. На гэта звярнуў увагу кіраўнік Урада Сяргей Сідорскі, які заўважыў, што калі ў час сусветнага фінансавага крызісу кошт жылля ў большасці суседніх краін таннее, то павінна таннець будаўніцтва кватэр і ў Беларусі. На мінулым пасяджэнні калегіі Мінбудархітэктуры было прынята рашэнне аб стрымліванні цэнаў на будаўніцтва жылля. Пра гэта, якія тэндэнцыі сёння назіраюцца ў сферы будаўніцтва жылля, і на іншыя пытанні карэспандэнту «Звязды» расказаў <u>начальнік упраўлення жыллёвага будаўніцтва Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Беларусі Аляксандр ГОРВАЛЬ.</u>**

**— Чытачы нашага выдання адзначаюць, што будаваць жыллё нават з дзяржаўнай падтрымкай апошнім часам робіцца непасільнай фінансавай ношай для небагатых беларусаў...**

— Адразу адзначу прыемную навіну для гэтай катэгорыі грамадзян. Днямі спецыялістамі галіны падрыхтавана прапанова аб павелічэнні тэрмінаў карыстання льготнымі крэдытамі пад 5 % гадавых у гарадах з 20 да 30 гадоў. Такое змяненне тэрмінаў павінна паменшыць штомесячныя выплаты па крэдытах, якія стануць больш даступныя для большасці насельніцтва.

**— Ці будзе міністэрствам рэгулявацца цана будаўніцтва жылля?**

— У першым квартале неабходна знізіць сабекошт будаўніцтва жылля. Гэта магчыма зрабіць па лініі двух фактараў. У першую чаргу — праз зніжэнне сабекошту будаўнічых матэрыялаў, такіх, як цэмент, шчэбень, шкло, жалезабетон, газасілікатныя вырабы і цэгла. Патанненне кошту гэтых пазіцый плануецца ажыццявіць на ўзроўні 5—10 % у найбліжэйшы час ужо ў сакавіку. Па другім фактары плануецца зніжэнне выдаткаў падрадных будаўнічых арганізацый. У выніку кошт будаўніцтва жылля для асобаў з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў павінен патаннець прыкладна на 5—7 %. Праўда, тут існуе і адмоўны бок такога патанення. У апошні час прадпрыемствы будаўнічай галіны толькі-толькі пачалі дзейнічаць з неабходнай для вытворчасці рэнтабельнасцю да 10 %. А цяпер ім гэтую рэнтабельнасць неабходна будзе зніжаць даволі істотна, а па асобных пазіцыях магчыма нават да нуля. Ці добра гэта? Пытанне складанае, бо вытворчасць працяглы час не можа паспяхова існаваць без абаротных сродкаў і прыбытку.

**— Такое патанненне будаўніцтва жылля мае аднамомантавы імпульсны характар або можа перарасці ў нейкую трывалую тэндэнцыю?**

— Хутчэй за ўсё, гаворка ідзе аб элеменце стрымлівання працэсаў даражэння будаўніцтва. Справа ў тым, што цяпер працягваюцца працэсы інфляцыі, даражэюць імпартныя пазіцыі будматэрыялаў, а аб'ём экспарту прадукцыі і паслуг будаўнічых прадпрыемстваў сёння паменшыўся. Нягледзячы на патаннелую ў свеце нафту, павялічваюцца тарыфы транспартных перавозак.

У выніку ўсіх гэтых фактараў мы маем разлічаны і зацверджаны міністэрствам рост індэксу будаўніча-мантажных работ па галіне ў памеры 15,5 % у год. Так, па плане будаўніцтва павінна падаражэць на 15,5 %, па вызначаных намі пазіцыях зараз яно прыкладна на 7 % патаннее, а ў выніку застаецца плюс 7—8 % падаражэння за год. Гэта датычыцца самых аптымістычных прагнозаў. Канчатковая лічба будзе залежаць ад мноства фактараў. Летась у галіне індэкс будаўніча-мантажных работ быў запланаваны ў аб'ёме 18 %, а фактычна атрымалі ўсе 25 % падаражэння будаўніцтва жылля...

**— Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на жылыя шматкватэрныя дамы ў Мінску, якія працяглы час не засяляюцца. Прэзідэнт патрабаваў, каб жыллё ў краіне не пуставала. Што робіцца міністэрствам у гэтым напрамку?**

— Нашымі спецыялістамі разглядаецца пытанне па вывучэнні сабекошту гэтага жылля. Па чым яно рэальна будавалася. Аднак зрабіць гэта даволі складана, бо камерцыйныя структуры не вельмі ахвотна згаджаюцца раскрываць складнікі сваіх выдаткаў. Яны не абавязаны па законе гэта рабіць, таму трэба шукаць дадатковыя кантакты. Галоўным чынам, гэтым павінна займацца не будаўнічая галіна, а мясцовыя органы ўлады. Мы, у сваю чаргу, павінны падвесці пад працэс размеркавання такога жылля нарматыўную базу. Павелічэнне аб'ёмаў крэдытавання па лініі шматдзетных сем'яў, калі плануецца задзейнічаць новыя нарматывы па даражэйшых дамах (пра што «Звязда» паведамляла ў нумары за 4 сакавіка) у спалучэнні з выяўленнем рэальнага кошту гэтых аб'ектаў дазволіла б гэта жыллё рэалізаваць для гэтай сацыяльнай катэгорыі насельніцтва. Сёння мы ўвогуле вывучаем агульную сітуацыю па пустым жыллі. Спачатку трэба ведаць, колькі існуе такіх кватэр, бо да гэтага такое жыллё ніхто не падлічваў.

З другога боку, застаецца шмат пытанняў па лініі ўласнасці, якія павінны вырашацца юрыстамі Дзяржкамітэта па маёмасці.

**— Існуе яшчэ адна праблема, калі здача шматкватэрных дамоў, нават па лініі ЖБК, ажыццяўляецца без аздаблення. Такія дамы потым засяляюцца на працягу часам некалькіх гадоў...**

— Цяпер у міністэрстве разглядаецца пытанне аб істотным павелічэнні працэнтнай долі жылля, якое здаецца з поўным аздабленнем. Задача будаўнічай галіны ў тым, каб усе работы ажыццяўляць у комплексе з выкарыстаннем айчынных будаўнічых матэрыялаў, якасць якіх за апошні час істотна павялічылася. Збіраемся наладзіць аднаўленне буйных аддзелачных структур, якія раней існавалі на домабудаўнічых камбінатах і будтрэстаў.

**— Сёлета трэба пабудаваць у краіне на 800 тысяч квадратных метраў жылля больш, чым летась. Будаўнікі гатовыя ўзводзіць такія аб'ёмы жылля?**

— Гэта лічба сапраўды велізарная. Улічваючы, што нейкіх істотных дадатковых магутнасцяў у будаўнічай галіне не ўводзіцца. Павелічэнне аб'ёмаў будзе ажыццяўляцца за кошт інтэнсіфікацыі працы, мадэрнізацыі кожнага будаўнічага падраздзялення. Па лініі зборна-панэльных дамоў, дамоў іншых танных серый, дзе будаўніцтва вядзецца з дзяржаўнай падтрымкай, будаўнікі працуюць ужо цяпер мінімум у дзве, а часам і ў тры змены і ў выхадныя. Калі не падтрымліваць такі інтэнсіўны тэмп працы, то «выцягнуць» запланаваныя аб'ёмы будаўніцтва жылля будзе немагчыма.

**Сяргей КУРКАЧ.**

*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 7.03.2009 г. (для б/н разлікаў)*

| | |
|---|---|
| 1 долар ЗША | 2 870,00 |
| 1 еўра | 3 647,20 |
| 1 латвійскі лат | 5 150,29 |
| 1 літоўскі літ | 1 054,70 |
| 1 чэшская крона | 129,88 |
| 1 польскі злоты | 767,85 |
| 1 расійскі рубель | 80,31 |
| 1 украінская грыўня | 365,61 |

*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў*

**Цэнтрабанк РФ**

| | |
|---|---|
| USD | 35,7374 |
| 10 UAH | 45,5254 |
| 1000 BYR | 12,4477 |
| EUR | 45,3686 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

*Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2009 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.*

*ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009*

ISSN 1990 - 763X

Нефармат

# БАБІНА ЛЕТА

Усе кругом пра вясну, кветкі, жаночае свята, а яна пра нейкае асенне-тужлівае бабіна лета, — заўважыць праніклівы чытач і будзе мець рацыю. Але сувязь такіх розных пораў года ён зразумее потым, калі яму стане сілаў дачытаць нататкі да канца. Нядаўна ў жаночай кампаніі зайшла гаворка пра сталых знакамітых жанчын, гераінь свецкіх хронік, якія звязваюць жыццё з нашмат маладзейшымі мужчынамі. Тэндэнцыя, нават мода апошняга часу. Прынята лічыць, што тым самым свецкія львіцы прыцягваюць да сябе ўвагу. А я думаю, што часта за гэтым стаіць звычайная боязь застацца адной, застацца без кахання. І нават багатыя, уплывовыя не зважаюць на тое, за якую саломінку хапаюцца, не думаюць, наколькі яна кволая.

Марына Уладзі не пабаялася старасці, адзіноты. Бо яна смелая, моцная, самадастатковая жанчына. У адным з інтэрв'ю Марына Уладзіміраўна Палякова-Байдарава сказала: «Я не хачу ніякіх раманаў. Мяне гэта болей не цікавіць. Я наогул жыву іншым жыццём. Сёння для мяне галоўнае — іграць, пісаць, сядзець дома, сустракацца з сям'ёй». Гэта годная пазіцыя моцнага духам чалавека. Тым больш што ў чалавека за плячыма чатыры шлюбы, і кожны — вялікае каханне. Рэжысёр Робер Асейн, лётчык Жан-Клод Бруйе, артыст Высоцкі і прафесар Леон Шварцэнберг. Паводле сцвярджэння Марыны, усе яны былі надзвычай таленавітыя людзі, а яшчэ яны з сімпатыяй ставіліся адно да аднаго, што здараецца вельмі рэдка. У адну з найпрыгажэйшых жанчын планеты былі ў розны час закаханыя Жан-Люк Гадар, Марчэла Мастраяні, Марлон Брандо, Арсон Уэлс, але з імі яна дазволіла сабе толькі сяброўскія, творчыя адносіны. І цяпер, у 70 гадоў, яна можа жыць багатым мінулым ды пісаць кніжкі аб тым, што ведае, што ёй асабліва дарагое. Такую восень жыцця яна заслужыла, такая восень стала яе асабістым выбарам. У згаданым інтэрв'ю Марына Уладзі сказала, што заўсёды плача, калі слухае запісы Марыі Калас.

Зорка сусветнай велічыні, якую заслужана называлі багіняй оперных спеваў, багатая, уплывовая жанчына вельмі цяжка закончыла жыццёвы шлях, па сутнасці загінула ад нешчаслівага кахання. Гісторыяй Марыі Калас мяне зацікавіў Вільнюскі тэатр, які аднойчы прывёз на тэатральны фестываль у Брэст спектакль пра грачанку з чароўным, непаўторным голасам.

Марыя нарадзілася ў беднай сям'і эмігрантаў у Нью-Йорку падчас вялікай дэпрэсіі. Неўзабаве сям'я вярнулася ў Афіны, дзе ў дзяўчынкі заўважылі выдатныя здольнасці. Маці літаральна катавала яе шматгадзіннымі заняткамі музыкай у надзеі некалі выбрацца з жабрацтва. Ужо ў 15 гадоў Марыя зарабляла канцэртамі неблагія грошы. Усё ў жыцці давалася ёй вялікай працай, нават уласнае цела. Ад прыроды таўстушка, за некалькі гадоў жорсткай дыетай яна паменшыла сваю вагу з 92 да 64 кілаграмаў і стала раскошнай прыгажуняй з антычнымі рысамі. У 24 гады Марыя Калас выйшла замуж за багатага прамыслоўца, удвая старэйшага. Па цяперашнім разуменні, шлюб з малавядомай спявачкай стаў для яго надзвычай удалым суперпраектам, куды ён укладаў грошы ад сваіх цагельных заводаў. І ўжо ў 30 гадоў дырэктары ўсіх прэстыжных оперных тэатраў Еўропы літаральна качаліся ў нагах дзівы, молячы падпісаць кантракт на выступленне.

Яна сустрэла сваё каханне ў Венецыі, на балі. Мульцімільярдэр Арыстоцель Анасіс на вачах у здзіўленай публікі забраў яе на сваю яхту. Здавалася, што свет яшчэ не ведаў такога вар'яцкага рамана. Яна кахала і не сумнявалася ў яго пачуццях. Марыя пакінула мужа і пераехала ў Парыж да яго. На сёмым годзе іх адносінаў, калі спявачцы было 43 гады, з'явілася нарэшце надзея стаць маці. Але Анасіс паставіў жорсткую ўмову: ён або дзіця. Яна падпарадкавалася. І гэта, відаць, была яе самая вялікая памылка ў жыцці. Лёс і яму адпомсціў: у аўтакатастрофе пазней загінуў яго сын, а дачка памерла ад перадазіроўкі наркотыкаў. Але ёй лёс адпомсціў утрайне. Праз некалькі гадоў Анасіс ажаніўся з удавой амерыканскага прэзідэнта Жаклін Кенэдзі, аб чым Марыі паведаміў сціслай запіскай.

Хутка пасля гэтага вялікая Калас страціла голас і стала пустэльніцай у сваёй кватэры. Жыццё для яе скончылася. У адным з апошніх лістоў Анасісу яна напісала: «Мой голас хацеў папярэдзіць мяне аб тым, што я хутка сустрэнуся з табой і ты знішчыш яго і мяне». Голас пакінуў «непараўнальную» ў пяцьдзесят гадоў, і літаральна за тры гады яна «згарэла». Вялікае багацце Калас, якое яна здабыла цяжкай працай і вялікім талентам, суддзі падзялілі паміж двума старымі, якія яе ніколі не любілі — мужам і маці. Як відаць, ад бабскай долі, калі яна нешчаслівая, не становяцца паратункам ні грошы, ні слава.

Да той пары, якую ў пераносным сэнсе называюць бабіным летам, як ні круці, трэба быць гатовай. А ў прамым сэнсе гэты выраз — «бабіна лета» — я асабіста ніколі не любіла. Паводле ўласных назіранняў, заўсёды здараецца, што лагодныя цёплыя дні перабіваюцца нечаканым холадам, да якога ніхто не гатовы. І з усіх бакоў тады чуецца: «Якія бабы — такое і лета». Не любіла, пакуль аднойчы не натрапіла на разгадку сапраўднага сэнсу выразу ў маленькім вершыку Яўгеніі Янішчыц:

*Над полем, над гасцінцам,*
*Мінаючы зямлю*
*На тонкай павуцінцы*
*Адчайнае «люблю».*

Сапраўды, паэты — алігархі пачуццяў.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

## БЕРАЖЫ КАРТКУ ЛЕПШ, ЧЫМ ГРОШЫ!

Беспрацоўны з в. Смаляніца Пружанскага раёна згубіў у бары «Эдэм» банкаўскую картку, з якой невядомы зняў 580 тысяч. Высветлена, што зрабіў гэта беспрацоўны з в. Лінова.

А ў Баранавічах адна жанчына выкрала банкаўскую картку ў знаёмай і разбагацела праз банкамат на 750 тысяч. Праўда, ненадоўга, бо і яе затрымалі.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ДЗВЕ ЖАНЧЫНЫ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

***— Марыя Іосіфаўна, якой вы ўяўлялі сабе будучую нявестку?***

— А менавіта такой і ўяўляла — рост, вага, даўжыня валасоў, колер вачэй (*смяецца*. — **Н. К.**)... Аднойчы ўбачыла, як ты танцуеш з маім сынам, і зразумела: вось яна... Хоць, шчыра кажучы, не думала, што ён так рана ажэніцца. Але сын паставіў перад фактам...

***— Спалохаліся?***

— Не. Чаго палохацца? У мяне ўжо быў вопыт. За некалькі гадоў да таго дачка Ірына прывяла ў дом прыгожага хлопца, свайго аднакурсніка, і сказала: «Знаёмся, мама, гэта Сяргей!». Я глянула — і зразумела, што перада мной не проста нейкі выпадковы Сярожа, гэта яе лёс... Так і ў выпадку з табой: адчула, што Наташа — не проста Наташа. Да таго ж, мне вельмі спадабалася тваё імя.

***— І толькі?..***

— Натуральна, мне вельмі хацелася, каб жонка майго сына была і разумнай, і прыгожай, і добрай, і таленавітай... А якая маці гэтага не хоча? Так яно, дарэчы, і аказалася.

***— Але, уяўляючы сабе суіснаванне на агульнай з нявесткай жылплошчы, вы, напэўна, загадзя выпрацавалі для сябе нейкую «лінію паводзінаў». Што гэта былі за ўстаноўкі?***

— Ды не было ніякіх установак! У мяне ў жыцці ўвогуле ўсё адбываецца спантанна. Ведаю толькі, што спачатку павінна паглядзець чалавеку ў вочы, і ўжо ад гэтага «ісці» далей. Такога ж прынцыпу, дарэчы, прытрымлівалася і ў працы, калі рэдагавала часопіс «Работніца і сялянка». Туды звярталіся жанчыны (ды і мужчыны) рознага рангу і з самымі рознымі праблемамі, просьбамі і нават патрабаваннямі. Я заўсёды прапаноўвала: прыязджайце ў рэдакцыю, заходзьце да мяне ў кабінет — мы з вамі паглядзім адно на аднаго, пагаворым. І разам падумаем, як лепш вырашыць ваша пытанне... Так што ў стасунках з нявесткай я нічога не загадвала наперад. Разумела, як ёй будзе няпроста ўжыцца ў новую сям'ю. Унутрана спачувала, бо некалі і сама пабывала ў гэтай «скуры» — прыйшла ў дом да свекрыві і свёкра, у якіх, акрамя майго мужа, было яшчэ тры сыны.



Свёкар быў палкоўнікам міліцыі, свякроў займалася хатняй гаспадаркай, жыццё ў іх ішло па раскладзе... Прыйшлося прыцірацца — часам падстройвацца, а часам і характар праяўляць.

***— Наша, так бы мовіць, «сумеснае жыццё» пачалося з таго, што я выпадкова разбіла вашу вазу — падарунак рэдакцыі «Магілёўскай праўды». Вы тады сказалі: добра не тое, што разбіла, а тое, што прызналася... Але, напэўна, вазу было шкада?***

— Ну, можа спачатку і было крыху шкада... Але потым глянула на цябе — твар бледны, вочы круглыя, вусны дрыжаць... Ды Бог з ёю, думаю, з гэтай вазай...

***— Ваза — гэта яшчэ «кветачкі»... А вось прафесія — яна, дарэчы, у нас з вамі агульная — накладвала пэўны адбітак на мой лад жыцця: частыя камандзіроўкі, шматлікія сустрэчы ў «няўрочны» час, позняе вяртанне дадому... Напэўна, карцела пачытаць нявестцы натацыю?***

— І аднойчы я табе яе ўсё ж прачытала — праз некалькі месяцаў вашага сямейнага жыцця... Памятаеш? Сёння ты пайшла на дыскатэку ў інтэрнат, заўтра — на дзень нараджэння да сяброўкі, паслязаўтра — на сустрэчу з аднакурснікамі... А твой муж сядзіць дома і чакае, пакуль з'явіцца яго маладая жонка.

***— Ну... у нас з ім была такая двухбаковая дамоўленасць: да нараджэння дзіцяці — ніякага «дамастрою», ніякага ўшчамлення інтарэсаў, ніякага прымусу...***

— Але ж пры гэтым ты яшчэ і вячэру «забывалася» гатаваць. Тады я сказала табе — заўваж, першы і апошні раз: будуйце вашы адносіны, як хочаце, я ў іх умешвацца не збіраюся. Але гарачая ежа на стале павінна быць заўсёды... Можа, у глыбіні душы ты і пакрыўдзілася, але крытыку ўспрыняла правільна. Ва ўсякім разе, больш у мяне не было падстаў для падобных заўваг.

***— Практычна адразу — дзесьці праз год сямейнага жыцця — вы аддзялілі нас фінансава. Мы разлічваліся па камунальных рахунках, жылі на свае даходы і карысталіся ўласным халадзільнікам. Грошай катастрафічна не хапала, затое з'явілася адчуванне незалежнасці і самастойнасці...***

— Многія нашы сем'і адрозніваюцца тым, што бацькі імкнуцца ўтрымліваць сваіх вялікаўзроставых дзяцей ледзь ці не да пенсіі... Ты некалі назвала мяне «еўрапейскай бабуляй» — спадзяюся, у добрым сэнсе гэтага словазлучэння. Дык вось, у Еўропе, дзе мне даводзілася бываць неаднойчы, адносіны паміж бацькамі і дзецьмі іншыя, больш незалежныя. Як толькі дзеці пачынаюць сябе забяспечваць, яны адразу ж «злазяць» з бацькоўскай шыі. Такі падыход спрыяе больш ранняму сталенню, выхоўвае дарослае стаўленне да жыцця. Гэта па-першае... Па-другое, я — таксама журналіст. Калі ты прыйшла ў нашу сям'ю, я кіравала жаночым часопісам. Ездзіла ў камандзіроўкі, шмат сустракалася з людзьмі, пісала артыкулы, займалася грамадскай работай... Ну, не магла я кожны дзень варыць вам супы, смажыць катлеты і гатаваць гарніры... Год папесціла — і хопіць. Далей адправіла вас у «вольнае плаванне», вырашыўшы, што сапраўдная «ячэйка» грамадства павінна быць эканамічна незалежнай.

***— «Плаванне» было сапраўды вольным, а вось «лодка», дакладней, кухня — агульнай... Кампраміс на агульнай кухні — умова пажаданая або неабходная?***

— Кампраміс — гэта ўвогуле вечны рух насустрач адно аднаму. Не толькі ў стасунках паміж нявесткай і свякрухай, але і ўвогуле. Дзякуй Богу, атрымалася так, што мы з табой абедзве аказаліся падсвядома гатовымі да кампрамісу, а значыць, увесь час стараліся пазбягаць сітуацый, якія потым прымушаюць людзей чырванець і пасля якіх узнікае душэўная і духоўная спустошанасць.

***— Многія, напэўна, пытаюцца ў вас: як гэта — жыць пад адным дахам з нявесткай?***

— Знаёмыя пастаянна цікавяцца: чаму вы ў свой час не размянялі кватэру?.. А навошта, адказваю я. Мой муж рана пайшоў з жыцця, і мне цяжка ўявіць, што цяпер я жыла б адна, няхай сабе і ў асобнай кватэры. Мне вельмі камфортна, калі побач — шмат людзей, калі жыццё віруе, калі ў госці прыходзіць дачка са сваёй сям'ёй, калі ўнукі дзеляцца ўражаннямі ад перажытага за дзень... Памойму, у гэтым маё выратаванне і... сапраўднае шчасце.

***— Мне здаецца, што з цягам часу мы з вамі ўвогуле пачалі лепш разумець адна адну...***

— А ведаеш чаму? Таму што ты сама стала мамай. І нарэшце зразумела, што такое абавязак у адносінах да дзяцей, да сям'і, да мужа. Насамрэч, калі людзі чымсьці абавязаны адно аднаму, гэта зусім не дрэнна, хоць, магчыма, і абмяжоўвае свабоду. Нельга плысці ў адной лодцы і адчуваць сябе свабодным ад іншых. Думаю, хоць і не адразу, але ты зразумела гэта. Ва ўсякім разе, я даўно ўжо не чула ад цябе фразы накшталт таго, што «кожны мае права жыць так, як ён хоча». Ты стала больш размаўляць са мной, дзяліцца ўнутранымі перажываннямі. Мне падабаецца, што, сустрэўшыся вечарам на кухні, мы рэдка размаўляем пра саму кухню, пра баршчы і пірагі, а стараемся выбіраць больш цікавыя тэмы для абмеркавання: падзеі ў журналісцкім асяродку, у грамадскім і культурным жыцці, у палітыцы... Для мяне ж вельмі важна — не выпадаць з «абоймы». Прыемна, што ты гэта разумееш.

***— Даўно хацела спытаць... На працягу многіх гадоў у розных жыццёвых сітуацыях вы практычна заўсёды прымалі мой бок, станавіліся на маю абарону... Хоць, падазраю, далёка не заўсёды былі са мной згодныя.***

— А я ўвогуле за жаночую салідарнасць, у тым ліку і на ўласнай кухні. Хто падтрымае жанчыну лепш за... іншую жанчыну? Па вялікім рахунку, я і павінна цябе падтрымліваць — як чалавек больш вопытны, больш сталы. Падтрымліваць — і адначасова далікатна падказваць, як лепш паступіць у гэтай сітуацыі.

***— Вы заўсёды былі вялікім дыпламатам...***

— Не перабольшвай. (*смяецца*. — **Н. К.**) Я заўсёды была мудрай свякроўкай.

**Наталля КАРПЕНКА.**

## НАШЫ БАБУЛІ БЫЛІ БОЛЬШ СТРОЙНЫЯ

Тое што сучасныя беларускі буйнейшыя за сваіх прабабак, факт агульнавядомы. Але яны працягваюць расці і ўвышыню, і ўшыркі. Да такой высновы прыйшлі... не, не вучоныя-антраполагі, а спецыялісты ўнітарнага прадпрыемства беларускіх народных рамёстваў «Скарбніца». Як расказала вядучы мастак прадпрыемства Алена Галіеўская, тут вялікая ўвага надаецца народным традыцыям. У прыватнасці, аднаўляецца серыя народных строяў па старажытных лякалах. І такія ўборы, як правіла, адразу асядаюць у галерэі «Скарбніцы». Паводле слоў мастачкі, нашы прабабкі былі значна стрыйнейшыя, чым праўнучкі, і танейшыя ў запясцях, і шыі ў іх былі больш вытанчаныя. Таму аўтэнтычныя строі на нашых сучасніцах часта проста не сыходзяцца. Для артыстак народных калектываў уборы ў «Скарбніцы» шыюцца з улікам асаблівасцяў іх фігур.

**Ала КАЗАКОВА,**
*«Мінск—Навіны».*

# Фермерка з Юзуфова

## Ярына Парфіяновіч разам з сям'ёй апрацоўвае 95 гектараў зямлі

**Ярына Фёдараўна Парфіяновіч — унікальны чалавек. Напэўна, гэта адзіная ў Беларусі жанчына, якая кіруе фермерскай гаспадаркай. І зусім не на паперы, як калі-нікалі здараецца, а насамрэч. Ярына Фёдараўна карыстаецца заслужанай павагай сярод аднавяскоўцаў, сваіх калег-мужчын, дзелавых партнёраў, навукоўцаў — кола зносінаў у Парфіяновіч вельмі вялікае. Магчыма, гэта з-за яе прафесіяналізму, стаўлення да сваёй справы, а таксама з-за адкрытага характару. «Я люблю людзей», — заўважае фермерка. І ў гэта пачынаеш верыць бадай што з першай хвіліны знаёмства з ёй.**



### ШАНЦ ДЛЯ «РАСКРУТКІ»

Ярына Фёдараўна родам з Заходняй Беларусі — са Шчучынскага раёна. Там прайшло яе дзяцінства. Бацькі трымалі вялікую гаспадарку: мелі ладны кавалак зямлі, якую разам з дзецьмі апрацоўвалі. Як узгадвае Парфіяновіч, яе дзед быў даволі моцным землеўладальнікам — калі яго дачка (маці Ярыны Фёдараўны) пабралася шлюбам, то бацька выдзеліў ёй у якасці пасагу тры гектары зямлі. На ўспамін пра сваю радзіму ў цяперашняй фермеркі засталіся заўсёдная прага да працы, а таксама рэдкае і прыгожае імя.

Пасля заканчэння школы Парфіяновіч паступіла ў Смілавіцкі сельгастэхнікум. Наступнай прыступкай была Горацкая сельскагаспадарчая акадэмія, дзе яна вучылася па агранамічнай спецыяльнасці. Паехала на Чэрвеньшчыну, дзе колькі гадоў адпрацавала ў вядомай гаспадарцы — калгасе «Бальшавік». А з 1983 года перабралася ў прысталічны раён — у вёску Юзуфова, дзе, дарэчы, жыве дасюль. «Больш за чвэрць стагоддзя на гэтым месцы, так што заслужана магу лічыцца тутэйшай», — усміхаецца Ярына Фёдараўна. Доўгі час жанчына працавала ў саўгасе «Буцэвічы». А пасля зрабіла даволі нечаканы для многіх крок — стала фермеркай.

— Чаму нечаканы? — паціскае плячыма Парфіяновіч. — Занялася фермерствам прымусіла жыццё. Вы ўзгадайце сітуацыю пачатку 1990-х гадоў: калгасы прыходзяць у заняпад, заробкі на вачах змяншаюцца. Трэба было нешта рабіць. Я жыла разам з сынам, неабходна было думаць і пра яго будучыню. А тут якраз закон аб зямлі прынялі, і з'явілася магчымасць узяць сабе ўчастак. Пагадзіцеся, грэх было не скарыстацца такім шанцам.

Калі ў калгасе падлічылі долю Ярыны Фёдараўны, то выйшла 4,8 гектара. Гэтую зямлю ёй выдзелілі каля вёскі Казекава, што ў некалькіх кіламетрах ад Юзуфова. Безумоўна, не зусім зручна, але магло быць і горш. Спачатку меркавалася «нарэзаць» фермерцы ўчастак за 18 км ад дому. Давялося змагацца за свае правы, і ў выніку быў знойдзены «кампрамісны варыянт». І ў 1992-м у Мінскім раёне з'явілася новая фермерская гаспадарка «Парфіяновіч Я. Ф.», кіраўніку якой на той час было 46 гадоў. Не самы спрыяльны ўзрост для «раскруткі», ды яшчэ трэба ўлічваць тое, што жанчына рэальна адна распачынала сваю справу на зямлі — сын тады быў у войску. Ні тэхнікі, ні ўгнаенняў, ні насення ў Парфіяновіч не было. Ды яшчэ давялося даволі доўга чакаць, пакуль калгас вызваліць выдзеленыя ёй плошчы. Таму пачынаць працу давялося не ў лепшыя тэрміны — ажно напрыканцы кастрычніка. Але нічога, выпісала трактар, сеялку і адсеялася. Першы ўраджай атрымаўся не надта вялікі, але даволі хутка справы пайшлі на лад. Парфіяновіч узяла крэдыт (як узгадвае, «хапіла на паўтрактара»), зрабіла неабходны ўзнос і набыла ў растэрміноўку першага «Беларуса». Цяжка было — даводзілася нават грошы ў суседзяў пазычаць, каб своечасова разлічвацца па крэдыце, інакш закрылі б рахунак. Аднак жанчына справілася з усімі перашкодамі.

### АД МЯСА ДА ГАРОДНІНЫ

Вельмі выручала ў той час фермераў тое, што хлебакамбінаты прымалі неачышчанае збожжа. Вядома, па меншым кошце, але для прыватнікаў, якія не мелі матэрыяльнай базы, гэта быў прымальны варыянт. Аднак Парфіяновіч не стала спыняцца толькі на прыбытковым збожжы. Адначасова яна занялася свінагадоўляй. Спачатку ў фермеркі было толькі тры свінаматкі, ад якіх атрымала 27 парасят. Вырошчвала іх проста ў двары, дзе зрабіла спецыяльную загарадку. Добра, што надвор'е не падвяло, пасля рэалізацыі таго мяса ўдалося ўзбіцца на грошы і не толькі разлічвацца па крэдытах, а і набыць штосьці з тэхнікі.

Зразумела, каб пракарміць некалькі дзясяткаў свіней (пагалоўе ў Парфіяновіч узрастала), неабходна было павялічыць плошчу ўчастка. Але як гэта зрабіць? Дапамог выпадак.

— Удзельнічала ў сельскагаспадарчай выставе, — узгадвае Ярына Фёдараўна. — Я аформіла свой куток у беларускім нацыянальным стылі: з саматканымі посцілкамі, ручнікамі, запякла парсючка, гуся, каўбасы павесіла. Зразумела, такі «стэнд» прыцягваў усеагульную ўвагу, бо калгасы не імкнуліся нечым здзівіць. Вядома, не маглі прайсці міма і члены ўрада, якія з цікавасцю спыніліся каля мяне. Спыталі і пра цяжкасці, а я без утойвання расказала пра неабходнасць павелічэння плошчаў. Літаральна на наступны дзень напісала заяву і дадаткова атрымала каля 30 гектараў зямлі.

Тут ужо жанчына і разгарнулася — у лепшыя часы трымала да 600 свіней. Першыя гады даглядала парсюкоў адна, толькі пасля таго, як крыху зарабіла грошай, здолела запрасіць памочніцу. Зразумела, пагалоўе павялічыла пасля таго, як пабудавала неабходнае памяшканне. Фермерка выкарыстоўвала самыя сучасныя тэхналогіі: кожная жывёліна мела аўтаматычныя кармушку і паілку. Таму даглядаць вялікае пагалоўе было нескладана. Свінагадоўля прыносіла нядрэнны прыбытак, Парфіяновіч атрымлівала вялікі ўраджай збожжавых, палову якога выкарыстоўвала на корм, астатняе рэалізоўвала дзяржаве. Такім чынам атрымлівалася добрая «эканоміка».

Але праз колькі гадоў ад свінагадоўлі давялося адмовіцца. Увялі новую схему ветэрынарнага кантролю, у адпаведнасці з якой неабходна было на кожную партыю афармляць тры даведкі. Рабіць дакументы трэба было як мінімум да абеду, за гэты час прадукцыя псавалася, і давялося ўсур'ёз задумацца наконт далейшых перспектыў «мяснога» кірунку. Тады Парфіяновіч паступова пачала згортваць пагалоўе і павялічваць плошчы пад агароднінай. За некалькі гадоў адпрацавала розныя гатункі сельскагаспадарчых культур — спрабавала вырошчваць памідоры, агуркі, капусту, буракі, бульбу. Адначасова дэталёва вывучала патрабаванні рынку. У выніку Ярына Фёдараўна прыйшла да гарманічнай структуры пасяўных плошчаў.

### ДВА ГЕНАДЗІ ДЫ АРЦЁМ

На 34 гектарах Парфіяновіч не спынілася — ёй удалося пашырыцца да 95 га. Атрымала дазвол і разуменне пасля размовы з кіраўніком дзяржавы. Прэзідэнт аднойчы праводзіў сустрэчу з фермерамі і звярнуўся з пытаннямі да Ярыны Фёдараўны (як яна кажа, «мабыць, таму, што я адзіная жанчына там была»). Парфіяновіч шчыра расказала, што не бачыць сэнсу «ганяць» тэхніку па даволі невялікім участку, каб атрымаць эфект, трэба мець большыя плошчы. Пасля было прынятае рашэнне: фермерам выдзяляць да 50 гектараў зямлі, а тыя гаспадаркі, якія эфектыўна развіваюцца, могуць атрымаць да 100 га. Напэўна, менавіта да апошняй катэгорыі аднеслі Ярыну Фёдараўну, і нездарма, паколькі ёй удалося арганізаваць сваю справу такім чынам, каб атрымліваць максімальны вынік. Чаго, да прыкладу, варты такі факт: рэнтабельнасць гаспадаркі Парфіяновіч рэдка калі складала менш чым 50 працэнтаў!

На палетках вырошчваецца традыцыйны «агародніінны» набор: 35-40 гектараў бульбы, 7-8 — капусты, 3-4 — буракоў, 3 — морквы і 1,5 — цыбулі. Астатняя плошча выкарыстоўваецца пад пару, паколькі Ярына Фёдараўна заўжды імкнецца выконваць севазварот. Ураджаі атрымлівае вышэйшыя, чым у сярэднім па раёне, але за лічбамі не гоніцца. Паколькі справядліва лічыць, што першая ўмова поспеху — якасная і смачная прадукцыя.

— Можна даць шмат угнаенняў і «выгнаць» вялікія аб'ёмы, але што я ў выніку прапаную людзям? — разважае Парфіяновіч. — Тут адно правіла: якім чынам сябе зарэкамендуе прыватнік, так ён далей і разгорнецца. Калі падвядзеш свайго спажыўца, то з табой проста больш працаваць не будуць. З рэалізацыяй праблем не ўзнікае, бо той, хто хоць аднойчы пакаштаваў нашу прадукцыю, становіцца пастаянным кліентам.

Рынак збыту ў Ярыны Фёдараўны дакладна напрацаваны — у асноўным цяпер пастаўляе вітамінную прадукцыю санаторыям, дзіцячым садкам, рэстаранам, кавярням, сталовым, вайскоўцам ды шмат каму яшчэ. У Парфіяновіч вялікае сховішча для гародніны, дзе створаны ўсе належныя ўмовы. Раней аддавала перавагу доўгатэрміновым кантрактам. Зыходзячы са сваіх плошчаў, можна больш-менш дакладна спрагназаваць ураджай. Таму дагаворы на пастаўку заключаюцца ўвесну і на цэлы год.

Зручная форма, аднак падчас крызісу такая схема падвяла, бо кантракты падпісваліся па фіксаванай цане. Але Парфіяновіч зусім не апускае рукі, паколькі ведае: на зямлі не прападзеш. Тым больш што сям'я заўсёды прыйдзе на дапамогу. Перш за ўсё гэта два Генадзі — муж і сын. У кожнага ў сямейным бізнэсе свае абавязкі. За Ярынай Фёдараўнай застаецца агульнае кіраўніцтва і бухгалтэрыя. Муж адказвае за электраабсталяванне, выкарыстанне і ўлік гаруча-змазачных матэрыялаў, налічэнне заробкаў. Сын «цягне», напэўна, самыя адказныя кірункі — стан тэхнікі, будаўніцтва і збыт прадукцыі. Цікава, што калі Генадзь вярнуўся з войска, то да маці ў фермерскую гаспадарку адразу не пайшоў, а ўладкаваўся на працу ў калгас. Паколькі не асабліва верыў у перспектывы ўласнай справы на зямлі. А пасля ўбачыў рэальныя вынікі матчынай дзейнасці і далучыўся. Дапамагае і ўнук Арцём, які зараз вучыцца ў дзясятым класе. Сям'я Парфіяновічаў шчыра працуе на сваёй зямлі. У фермерскай гаспадарцы два наёмныя работнікі, з вясны да восені спраў хапае ўсім. І Ярына Фёдараўна ў свае 62 гады можа, калі трэба, і за руль трактара сесці.

— Пачатак сакавіка, усё больш прыпякае сонейка — значыць, хутка сяўба, да яе мы як належыць падрыхтаваліся, — кажа Ярына Фёдараўна. — Так што жаночае свята можна адзначаць з лёгкай душой...

**Мікалай ЛІТВІНАЎ.**
**Фота аўтара.**

Модны базар

# УСЯ ПАЛІТРА ВЯСНЫ: ЯРКА, ЛЁГКА І З ФАНТАЗІЯЙ

Крызіс крызісам, а добра выглядаць хочацца заўжды. Няхай сабе і не паводле запавету модных гуру — як быццам цябе толькі што дасталі з падарункавай упакоўкі — проста, каб падабацца сабе і навакольным. Асабліва гэта датычыцца вясны, калі са спячкі выходзіць і арганізм, і вытворцы адзення — напярэдадні новага сезона. І зусім неабавязкова несціся ў краму за рэчамі «з імем», варта толькі прыслухацца да модных тэндэнцый вясны-2009 — і падабраць з іх тыя, што найбольш пасуюць менавіта вам. На што ж раяць звяртаць увагу стылісты і модныя дызайнеры гэтай вясной?

**КОЛЕР** Усяго за адзін сезон уладаранне чорнага скончылася, і на сцэну выйшаў ідэальна белы колер, а таксама ўсе яркія, нават кіслотныя адценні. Нават для акуляраў рэкамендаваныя белая альбо яркая рамка. Прычым, гэта цалкам у духу цяперашняга часу: белы колер абазначае пачатак і выдатна падыходзіць усім, хто жадае пачаць жыццё з чыстага ліста, наноў, або проста шукае перамен. Для тых хто не гатовы радыкальна мяняцца, — умова: спалучаць стрыманыя колеры з яркімі аксесуарамі.





Як і ў леташнім вясенне-летнім сезоне, папулярнасць захоўвае адценне металіку, які дабаўляе вобразу яркасць, гламур і сучаснасць. Але важна не перастарацца з металічным бляскам — у вялікай колькасці бліскучы металік стварае дадатковы аб'ём, а яго мала хто сабе можа дазволіць.

**ФОРМЫ** Найбольшы камерцыйны поспех напачатку вясны стылісты прагназуюць лёгкім бясформенным плашчам — яны ствараюць мяккі і ненавязлівы жаноцкі вобраз. У такіх мадэлях жанчына сама выбірае, «дзе будзем талію рабіць», і можа выгадна падкрэсліць яе поясам.





Яшчэ адна надзвычай актуальная тэндэнцыя — асіметрыя. «Рваныя» краі спадніц, няроўныя гарлавіны, як быццам збіты набок пасок — не бойцеся выглядаць нязвыкла, бо крыху «неідэальнасці» — гэта натуральна!

**МАЛЮНКІ** У дзяцінстве многія з нас ціха ненавідзелі тыя сукенкі, блузкі і спадніцы «ў гарошак», якія ўпарта выбіралі для нас мамы. А цяпер гарох усіх колераў і памераў, ад ледзьве заўважных кропак да класічнага рэтра-стылю, уявіце сабе, модны. І гэта зноў жа, тлумачаць стылісты, адпавядае часу — у цяжкі перыяд падсілкавацца энергіяй можна ў тым ліку за кошт успамінаў дзяцінства — банты, гарошынкі, гетры і гольфы — ад гэтага жанчыны маладзеюць на вачах, ператвараючыся ў гарэзлівых дзяўчат.





Зрэшты, чаму толькі жанчыны? Наступны папулярны прынт — кветкі — заўжды запатрабаваны вясной і летам, да таго ж падыходзіць і мужчынам таксама. Да таго ж кветкавыя малюнкі выдатна ажыўляюць нават самыя стрыманыя колеры і строгія сілуэты. Толькі што не пахнуць.

На змену павальнаму зіхаценню прыходзіць няўлоўная, лятучая прыгажосць — матылькі. (Што характэрна — як узгадваюць крытыкі моды, гэты малюнак быў надзвычай папулярны падчас мінулага фінансавага крызісу 1998 года). Матылькі, у залежнасці ад памеру, колеру і структуры малюнка, могуць сімвалізаваць цэлую гаму пачуццяў — ад надзеі на лепшае да эфемернасці нашага існавання. Але галоўны акцэнт у іх — зграбнасць і жаноцкасць — «дарослая», без гульні ў малое дзяўчо.

**ЭЛЕМЕНТАРНА** Стыль сафары, традыцыйны для летняга сезону, заявіць аб сабе і ўвесну, але не настолькі рашуча — не цэлымі калекцыямі, хутчэй, асобнымі элементамі. Пясочнага колеру пальчаткі і капелюшы, буйныя кішэні (у вялікай колькасці раскіданыя па вопратцы), шыйныя хусцінкі для абодвух палоў — усё гэта, натуральна, не ператворыць вас у Індыяну Джонса ці Лару Крофт, але пэўны намёк на прыгодніцкі дух зробіць.



Калі вы жадаеце выглядаць хутчэй не даследчыкам, а абарыгенам — варта звярнуць увагу на этнічны стыль, тым больш што буйныя ўпрыгажэнні, штаны-шаравары, яркага колеру блузкі з моды не выходзяць, нават наадварот.

Вельмі папулярным абяцае стаць вобраз юнай парыжанкі — а гэта лёгкае паліто, з пяшчотнага шоўку блузка, шалік з махрой, балеткі і — ледзьве не галоўнае — берэт. Што з гэтага больш пасуе вам — падбярыце перад люстэркам, пад гукі музыкі з фільма «Амелі».

Махры! Раней яны спадарожнічалі ўборам, цяпер робяцца самастойным трэндам. Як альтэрнатыва ім — імітацыя пуху і пер'я, напрыклад, на рукавах, плячах, паясах, спадніцах і нават туфлях. Раcпраўце крылы, адчуйце свабоду руху, дыхайце вясной — ці, як там гэта было ў класіцы, «прачніся і спявай»! Пачысціць пер'е, перагледзець гардэроб, штосьці дабавіць, штосьці «спісаць» — у любым выпадку ніколі не шкодна.

**РУЧНАЯ РАБОТА** Уласнаручна аздобленае адзенне — вышыўкай, бісерапляценнем, аплікацыяй — чым пажадаеце — цэніцца як ніколі. Бо сведчыць не толькі пра вашу фантазію і знаёмства з моднымі тэндэнцыямі, але і пра пэўныя ўменні. Акрамя таго, нават маленькая дэталь можа паўплываць на цэласны імідж, так што даставайце з шафы пруткі і кручкі, здымайце чахлы са швейнай машынкі, не забудзьцеся на пяльцы — і наперад, ствараць маленькія шэдэўры.

**Ліна МАЛІНІНА.**

# Крама нізкіх цэнаў адкрылася ў Віцебску



Фота БЕЛТА.



У Віцебску адкрылася першая ў вобласці крама нізкіх цэнаў, паведаміў начальнік упраўлення гандлю Віцебскага аблвыканкама Аляксей Шчабляцоў. Адно з буйных гандлёвых прадпрыемстваў рэгіёна ААТ «Ніка» вырашыла нарошчваць тавараабарот не за кошт павелічэння гандлёвых надбавак, а за кошт росту аб'ёмаў продажу. Так, у новай краме надбаўкі на прадукты харчавання, прамысловыя тавары першай неабходнасці, акрамя цукру, тытунёвых вырабаў і некаторых відаў алкагольнай прадукцыі, складаюць ад 1 да 10 %, у той час як на іншых гандлёвых аб'ектах яны дасягаюць 30 %. Пры гэтым асартымент харчовых тавараў і іх якасць не саступаюць аднолькавым паказчыкам іншых крамаў. Гандлёвы аб'ект размешчаны ў аддаленым раёне горада, дзе большую частку насельніцтва складаюць пенсіянеры. Адміністрацыя крамы разлічвае невысокімі цэнамі прыцягнуць больш пакупнікоў і павялічыць тавараабарот больш чым у 4,5 раза ў параўнанні з іншымі пунктамі сваёй гандлёвай сеткі.

**Дзіяна КУРЫЛА.**

Святая справа

## 200 мільёнаў рублёў для адраджэння праваслаўнай святыні

Манахіні, якія адраджаюць у вёсцы Баркалабава Быхаўскага раёна манастыр, звярнуліся па дапамогу да абласных улад. Схігуменню Антонію прыняў старшыня Магілёўскага аблвыканкама Пётр Руднік.

У Баркалабаве ў старажытнасці існаваў вялікі праваслаўны Свята-Вазнясенскі манастыр. Яго храмы былі ўзведзены на беразе Дняпра ў XVII стагоддзі, а канчаткова разбураныя — у савецкія і атэістычныя 1930-я гады. Цяпер царква вырашыла адрадзіць манастыр, і летась у Баркалабава прыехалі 9 жанчын, каб пачаць справу. У знак адраджэння яны ўсталявалі на пагорку крыж і палатку для службаў і малітваў.

Аднак праектаванне і будаўніцтва манастыра патрабуе шмат сродкаў. Дастатковы сумы цяжка сабраць з дапамогай ахвяраванняў вернікаў. Таму ўлады вырашылі дапамагчы адраджэнню старажытнай святыні ў Баркалабаве і выдаткавалі 200 мільёнаў рублёў.

Увесну ў Баркалабаве працягнуцца археалагічныя раскопкі, мяркуецца пачаць і новае будаўніцтва. Манахіні, якія адраджаюць Свята-Вазнясенскі манастыр, вераць, што сюды вернецца і знакаміты абраз Баркалабаўскай Божай Маці, які народ лічыць цудатворным. Сёння абраз захоўваецца ў раённым цэнтры Быхаве.

**Ілона ІВАНОВА.**

Крымінал

## Украў сабаку каштоўнай пароды

Да трох гадоў пазбаўлення волі можа атрымаць 35-гадовы мінчанін, які ўкраў сабаку рэдкай пароды каля дзвярэй крамы ў доме № 44 на праспекце Незалежнасці. Аб прапажы чатырохногага сябра ў дзяжурную часць Савецкага РУУС паведаміў 27-гадовы жыхар сталіцы. Паводле слоў пацярпелага, ён прывязаў сабаку каля ўваходу ў гандлёвую ўстанову і пайшоў туды па пакупкі, а калі вярнуўся, выявіў прапажу. Міліцыянеры спрацавалі аператыўна і праз 40 хвілін затрымалі падазронага. Высветлілася, што злодзей ужо быў раней асуджаны за крадзеж. Ён прызнаўся, што хацеў утаргаваць за жывёліну значную суму.

**Ігар ГОЛАД, «Мінск—Навіны».**

# Прыгожая лічба 13

Напярэдадні міжнароднага жаночага свята сярод працаўніц вытворчасці «Мінская пошта» і апарату кіраўніцтва РУП «Белпошта» прайшоў конкурс «Міс Пошта», у якім узялі ўдзел трынаццаць прыгажунь.



Пераможца конкурсу Святлана КАРКУНОВА.

На працягу пяці складаных этапаў яны дэманстравалі прыгажосць і грацыю, спявалі, танчылі, гатавалі ежу, распавядалі пра свой ідэал мужчыны і пра будучыню беларускай пошты, удзельнічалі ў паказе пляжных касцюмаў і вячэрніх сукенак.

Строгае журы аддало перавагу інжынеру аддзела паштовых тэхналогій упраўлення паштовых тэхналогій і лагістыкі Святлане Каркуновай. Віцэ-міс стала інжынер упраўлення рэалізацыі і продажу Кацярына Гандзь. «Міс Чароўнасць» — тэхнік паштовай сувязі цэха па аказанні паслуг Люцыя Смільгіна, «Міс глядацкіх сімпатый» — Паліна Федарэц — аператар сувязі ВЦ «Марка». Усе ўдзельніцы атрымалі памятныя дыпломы і каштоўныя падарункі.

**Вольга ГРЫКІНА.**
**Фота аўтара.**

## БІЛЕТАЎ НА «МІЛЬЯНЕРА» ХОПІЦЬ УСІМ

**Тэрмін дэманстрацыі ўладальніка васьмі «Оскараў» карціны «Мільянер з трушчобаў» у Мінску падоўжаны да 25 сакавіка ўключна. Пра гэта паведаміў генеральны дырэктар УП «Кінавідэапракат» Васіль Коктыш.**

Дэманстрацыя фільма пачалася ў мультыплексе «Беларусь» 27 лютага і, як планавалася, працягвалася на працягу трох тыдняў. Аднак у сувязі з ажыятажнай цікавасцю да карціны «Кінавідэапракат» правёў перамовы аб магчымасці падаўжэння тэрміну дэманстрацыі.

Васіль Коктыш сказаў, што ўсе ахвотныя маюць магчымасць паглядзець гэты суперпапулярны фільм на экране ў «Беларусі». У будныя дні ідзе чатыры сеансы, у выхадныя — пяць. Кошт білетаў — Br10 тыс., у касах кінатэатра адкрыты папярэдні продаж. «Білетаў усім хопіць, трэба толькі паклапаціцца пра гэта загадзя. Няма неабходнасці звяртацца да перакупшчыкаў, якія ўсялякі ва прапануюць перад сеансам амаль удвая даражэйшыя білеты», — перасцярог Васіль Коктыш.

Фільм «Мільянер з трушчобаў» стаў трыумфатарам 81-й цырымоніі ўручэння прэміі «Оскар» сёлета ў Лос-Анджэлесе.

**БЕЛТА.**

# ЗАМЕСТ ДЖЫНСАЎ — ДЗЕЛАВОЕ АДЗЕННЕ

**Афіцыйна школьную форму адмянілі ў беларускіх школах у пачатку 90-х гадоў, але яшчэ пэўны час, напэўна, хутчэй па інерцыі, савецкая школьная форма са школьнага жыцця цалкам не выходзіла. Затым у школах «прапісаўся» цалкам вольны стыль, калі ўсе рамкі дазволенага былі разбураныя і вулічная мода з красоўкамі, джынсамі, бясформеннымі штанамі і агаленымі жыватамі непрыкметна перапаўзла ў школьныя класы. Таму калі чатыры гады таму Міністэрства адукацыі агучыла намер узяць знешні выгляд беларускіх школьнікаў пад свой кантроль, гэта ідэя была прынята вельмі многімі ў штыкі. Зразумела, што самымі гарачымі апанентамі ўвядзення школьнага адзення былі старшакласнікі — гэта менавіта той узрост, калі падлеткі імкнуцца да індывідуальнасці і прад'яўляюць асабліва высокія патрабаванні да свайго знешняга выгляду. Тым не менш спатрэбілася ўсяго тры гады, каб беларускія школьнікі цалкам перайшлі на нашэнне школьнага адзення дзелавога стылю. Усе пытанні па яго ўкараненні, вытворчасці і рэалізацыі былі ўскладзены на Каардынацыйны савет, у які ўвайшлі прадстаўнікі міністэрстваў адукацыі, гандлю, аховы здароўя, канцэрна «Беллегпрам», Белкаапсаюза, Мінгарвыканкама і Мінаблвыканкама. Днямі адбылося чарговае пасяджэнне савета.**



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Як паведаміла **начальнік упраўлення спажывецкага рынку нехарчовых тавараў Міністэрства гандлю Ніна ПАШКО**, у разгар спажывецкага попыту, гэта значыць, у ліпені-жніўні, у гандлёвых арганізацыях можна было знайсці больш як 200 мадэляў адзення для дзяўчатак, 170 мадэляў адзення для хлопчыкаў і 115 мадэляў абутку. Плюс джэмперы, світары, спартыўнае адзенне... Усяго прадпрыемствамі канцэрна «Беллегпрам» было выпушчана 651,3 тысячы адзінак швейных і 426,9 тысячы адзінак трыкатажных вырабаў — гэта ў паўтара раза больш у параўнанні з папярэднім годам.

Між іншым, Ніна Пашко перакананая, што звужаць мадэльны рад адзення дзелавога стылю для школьнікаў ні ў якім разе нельга: «Пакупнікі заўсёды просяць даць ім магчымасць выбару, таму што ў дзяцей могуць быць і нестандартныя фігуры, і розныя каляровыя прыхільнасці. Да таго ж падлеткаў палохае магчымая аднастайнасць у адзенні. Я хачу заўважыць, што нават у савецкія часы было распрацавана 200 (!) мадэляў славутай школьнай карычневай сукенкі. Толькі колер сукенак ва ўсіх дзяўчат быў аднолькавы, а мадэлі — адрозніваліся... Трэба таксама дадаць, што нават пры вельмі шырокім асартыменце, распрацаваным канцэрнам «Беллегпрам», мы не змаглі задаволіць у мінулым годзе попыт пэўнай часткі моладзі на моднае і стыльнае адзенне з сучасных тканін. Недастатковым быў выбар блузаў з кароткімі і доўгімі рукавамі, штаноў, касцюмаў дзелавога стылю для дзяўчат. Дзяўчаты-падлеткі ўвогуле самая праблемная катэгорыя. Не ў поўнай меры быў задаволены попыт на дзявочыя фуфайкі. Калі раней дзяўчаты насілі пакарочаныя майкі і фуфайкі, то сёння для штаноў з нізкай таліяй ім патрабуюцца больш доўгія фуфайкі, прычым, пажадана, каб яны выраблякіся не са стапрацэнтнай бавоўны, а з дабаўленнем у бавоўну эластану. Такая фуфайка будзе мець лепшыя эксплуатацыйныя характарыстыкі і трымаць форму. Абмежаванай аказалася каляровая гама і мадэльны рад кашуляў для падлеткаў. Пакупнікі просяць пашыць для хлопчыкаў больш разнастайны асартымент касцюмаў, кашуляў і пінжакоў з вельветавых тканін, а таксама забяспечыць гандаль кашулямі з утрыманнем шэрсці, якія можна было б насіць у халодны час года. Многія незадаволеныя даволі змрочнай каляровай гамай адзення для школы і занадта колкімі тканінамі».

**Адзенне для школы павінна быць практычным, элегантным, гігіенічным, сучасным, шматфункцыянальным, зручным, выхоўваць у падрастаючага пакалення добры густ, адпавядаць дзелавой абстаноўцы і не адцягваць увагу ад навучальнага працэсу.**

— Дзелавы стыль адзення не павінен абмяжоўвацца толькі чорнымі, шэрымі і карычневымі колерамі, — падзялілася сваім бачаннем гэтай праблемы **намеснік міністра аховы здароўя, Галоўны дзяржаўны санітарны ўрач Рэспублікі Беларусь Валянціна КАЧАН**. — Каляровая гама можа вельмі негатыўна адбівацца на нервовай сістэме дзіцяці, асабліва дзяўчат. І мы не можам гэта не ўлічваць. Больш увагі трэба надаваць і айчыннаму дзіцячаму абутку. Усім вядома, што бацькі сёння не эканомяць і набываюць для дзяцей дарагі імпартны абутак, таму што якасны абутак — гэта прафілактыка і плоскаступнёвасці, і праблем з фарміраваннем постаці, і многіх іншых праблем.

Валянціна Качан паведаміла членам Каардынацыйнага савета, што цяпер вядзецца работа над распрацоўкай новых гігіенічных патрабаванняў да штодзённага адзення для вучняў агульнаадукацыйных школ. Згодна з дзейнымі сёння санітарна-гігіенічнымі патрабаваннямі, дапушчальныя ўкладанні сінтэтычных валокнаў і нітак у тэкстыльных матэрыялах школьнага адзення не павінны перавышаць 30-35 % у вырабах блузкавага і кашульнага асартыменту і 55 % у вырабах касцюмнага і сукенкавага асартыменту. Сто працэнтаў укладання сінтэтычных валокнаў дапускаецца толькі ў мадэлях, якія трапляюць у катэгорыю «святочнае адзенне». Але не сакрэт, што вытворцы нярэдка захапляюцца выпускам «святочнага адзення» і нават правакуюць школьнікаў насіць гэта адзенне штодня. Мяркуецца, што ў новых СанПіНах будуць прадугледжаны пэўныя адхіленні ад цяперашніх жорсткіх нормаў па ўкладанні хімічных валокнаў. Вынікі лабараторных даследаванняў сведчаць, што ў асобных відах тэкстыльных матэрыялаў паказчыкі гіграскапічнасці змяняюцца пасля мыцця ў лепшы бок, а паказчыкі паветрапранікальнасці, наадварот, пагаршаюцца. У сучаснай сінтэтыцы могуць выкарыстоўвацца мікравалокны, якія прапускаюць паветра не горш, чым натуральныя тканіны. На вытворчасці ўкараняюцца новыя тэхналагічныя працэсы, з'яўляецца новае абсталяванне. Усё гэта таксама трэба ўлічваць.

— Але наша прынцыповая пазіцыя не змяняецца, — падкрэсліла Валянціна Качан. — Галоўнае — гэта здароўе дзяцей, таму адзенне, якое школьнік носіць штодня, павінна быць камфортным, гігіенічным, і мець самыя лепшыя эксплуатацыйныя характарыстыкі...

**Першы намеснік старшыні канцэрна «Беллегпрам» Уладзімір АСТРОЎСКІ** расказаў, што нядаўна для камвольнага камбіната было закуплена спецыяльнае абсталяванне для змякчэння тканін. У новай школьнай калекцыі, якая ўжо знаходзіцца ў рабоце, будуць мадэлі з новых тканін — лёну з віскозай і шэрсцю. Мадэльерамі Рэспубліканскага цэнтра моды падрыхтавана калекцыя адзення для выпускных вечароў. Адным словам, хапіла б толькі ў бацькоў фінансавых магчымасцяў...

**Адзенне можа быць выканана ў рознай колеравай гаме, уключаць элементы з тканін у клетку, але не быць стракатым і занадта яркім.**

Але па адным пытанні члены Каардынацыйнага савета ўсё ж такі ніяк не могуць дамовіцца. Яшчэ два гады таму абмяркоўвалася ўвядзенне спецыяльнай маркіроўкі для мадэляў, рэкамендаваных Каардынацыйным саветам. Брэнд «Класнае адзенне» планавалася зарэгістраваць, каб ім не маглі скарыстацца несумленныя вытворцы. Для пакупнікоў ён бы быў арыенцірам, што мадэль адпавядае патрабаванням Міністэрства аховы здароўя, а для вытворцаў — цудоўнай рэкламай і сродкам прасоўвання прадукцыі на рынку.

Але ў канцэрна «Беллегпрам» і прадстаўнікоў гандлю ёсць апасенні, што калі адзенне будзе прамаркіраванае як школьнае адзенне, на яго можа знізіцца попыт: некаторыя школьнікі (асабліва падлеткі) будуць адмаўляцца насіць прамаркіраванае «абавязковае» адзенне. На такое адзенне не будуць звяртаць увагі і іншыя катэгорыі пакупнікоў, якія не трапляюць у катэгорыю школьнікаў. Дарэчы, на 1 студзеня рэшткі леташняй калекцыі складалі ў гандлі 100—120 тысяч адзінак (на 1 верасня 142 тысячы). Гэта значыць, што пакупнікі на адзенне дзелавога стылю знаходзяцца круглы год.

Падводзячы вынікі пасяджэння, **старшыня Каардынацыйнага савета, намеснік міністра адукацыі Казімір ФАРЫНО** засяродзіў увагу членаў савета на неабходнасці ўдасканалення сістэмы рэалізацыі адзення дзелавога стылю і пашырэння комплексу паслуг па яго продажы. Летась гандлёвыя прадпрыемствы пайшлі на такі крок, як раздзяленне камплектаў і ацэньванне кожнага элемента асобна, на раскамплектаванне і падбор па размерных параметрах, на прыём папярэдніх заказаў і водпуск школьных тавараў у крэдыт. Першы шырокамаштабны паказ новай калекцыі адзення пройдзе ў красавіку на выставе «БелТэкслегпрам». А затым па традыцыі паказы школьнага адзення дзелавога стылю пройдуць ва ўсіх рэгіёнах краіны.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.


Минский городской центр недвижимости

## УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ»

**3 апреля 2009 г. проводит открытый аукцион № 02-А-09 на право заключения договоров аренды земельных участков**

**Вид аукциона:** открытый (на повышение цены продажи).
**Предмет аукциона:** право заключения договора аренды земельного участка.
Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.
На торги выставляется право аренды на 5 лет 14 земельных участков для строительства в г. Минске:

| Лот № | Месторасположение земельного участка | Кадастровый номер земельного участка | S, га | Функциональное назначение предполагаемого объекта строительства | Начальная цена предмета аукциона (долларов США[1]) | Сумма задатка, бел. руб. | Расходы на подготовку документации для проведения аукциона, бел. руб. | Условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| 1 | микрорайон Каменная Горка-5 | 500000000006004518 | 0,4466 | Предприятие торговли продовольственными товарами общественного питания (по генплану № 65) | 114 633 | 21 664 800 | 3 783 368 | возмещение убытков КУП «УКС Мингорисполкома» в размере 425 584 бел. руб. |
| 2 | микрорайон Каменная Горка-5 | 500000000006004520 | 0,3119 | Магазин продовольственных товаров (по генплану № 66) | 80 058 | 15 130 800 | 3 675 858 | возмещение убытков КУП «УКС Мингорисполкома» в размере 287 222 бел. руб. |
| 3 | ул. Шабаны (микрорайон Шабаны-1) | 500000000002004721 | 0,4793 | ФОК с объектами общественного питания и сопутствующей торговли | 97 231 | 18 376 200 | 3 186 247 | — |
| 4 | микрорайон Ангарская-2 | 500000000002004971 | 0,2517 | ФОК и развлекательный комплекс с объектами общественного питания и сопутствующей торговли (по генплану № № 71, 72) | 65 822 | 12 441 600 | 3 161 667 | — |
| 5 | микрорайон Малиновка-5 | 500000000005004299 | 0,6905 | ФОК с объектами общественного питания и сопутствующей торговли (по генплану № 20) | 165 803 | 31 336 200 | 4 353 945 | — |
| 6 | ул. Янковского (микрорайон Сухарево-7) | 500000000006004110 | 0,2445 | ФО и развлекательный комплекс с крытым плавательным бассейном, объектами общественного питания и торговли | 64 614 | 12 212 100 | 3 110 386 | — |
| 7 | Слепянская водная система от ул. Плеханова до ул. Малинина | 500000000003002923 | 0,2378 | ФОК с сопутствующими объектами общественного питания, торговли и обслуживания населения в составе объекта «Лыжероллерная трасса в составе Слепянской водной системы от ул. Плеханова до ул. Малинина» | 61 203 | 11 566 800 | 7 027 916 | возмещение потерь сельскохозяйственного производства в сумме 10 346 800 бел. руб. |
| 8 | ул. Скрипникова — ул. Одинцова (микрорайон Красный Бор-II) | 500000000006004385 | 0,5496 | Многоэтажная гараж-стоянка с сервисным центром и помещениями торгового и общественного назначения (по генплану № 87) | 139 260 | 26 319 600 | 2 342 175 | возмещение убытков КУП «УКС Мингорисполкома» в размере 8 642 390 бел. руб. |
| 9 | ул. Скрипникова — ул. Одинцова (микрорайон Красный Бор-II) | 500000000006004384 | 0,4863 | Многоэтажная гараж-стоянка с сервисным центром и помещениями торгового и общественного назначения (по генплану № 85) | 123 221 | 23 287 500 | 2 342 175 | возмещение убытков КУП «УКС Мингорисполкома» в размере 7 647 000 бел. руб. |
| 10 | ул. Янковского — ул. Горецкого — ул. Проектируемая | 500000000006004117 | 1,9073 | Многоуровневая автостоянка на 900 м/м с сервисным центром, объектами торгового и общественного назначения (по генплану № 14) | 493 188 | 93 212 100 | 5 614 250 | возмещение убытков ОАО «Мапид» в размере 121 539 450 бел. руб. |
| 11 | ул. Матусевича (микрорайон Масюковщина-3) | 500000000006004109 | 0,3754 | Крытые теннисные корты с помещениями общественного питания и физкультурно-оздоровительного обслуживания населения | 95 063 | 17 965 800 | 2 874 493 | — |
| 12 | ул. Лобанка (между микрорайонами Сухарево-2,3 и Сухарево-6) | 500000000006004003 | 1,818 | Многофункциональный культурно-досуговый комплекс | 481 697 | 91 041 300 | 4 981 994 | — |
| 13 | ул. Рябиновая — ул. Проектируемая № 1 (жилой район Сокол) | 500000000004002968 | 2,1987 | Малоэтажная (1-3 эт.) застройка | 383 827 | 72 543 600 | 3 949 186 | — |
| 14 | Парк общегородского значения, в квартале пр. Независимости — ул. Филимонова — ул. Ф. Скорины | 500000000009003594 | 0,127 | Объект общественного питания (по генплану № 25) | 33 913 | 6 409 800 | 3 930 552 | — |

*[1] Плата за предмет аукциона вносится в белорусских рублях по курсу Национального банка Республики Беларусь, установленному на дату внесения денежных средств.*

Земельные участки свободны от застройки. Инженерное развитие инфраструктуры застраиваемой территории участков осуществляется в соответствии с техническими условиями на инженерно-техническое обеспечение соответствующего объекта, выданными эксплуатирующими и согласующими организациями (согласно перечню, установленному Минским горисполкомом).

Аукцион состоится **3 апреля 2009 года в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

**Для участия в аукционе необходимо:**

**внести задаток** в размере 7 % от начальной цены заявленного лота (лота с наибольшей стоимостью – в случае участия в торгах по нескольким лотам), перечисляемый на расчетный счет № 3641000000016 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка – 795, УНП – 100690830, назначение платежа – 04002, получатель – Финансовое управление Мингорисполкома (задатки по лотам вносятся в белорусских рублях в суммах согласно настоящему извещению);

**представить в адрес УП «Минский городской центр недвижимости» следующие документы:**

заявление на участие в аукционе установленной формы;

заверенную банком копию платежного документа, подтверждающего внесение задатка в установленном размере;

подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, в соответствии с которым участник аукциона, победивший в торгах, либо которому земельный участок предоставляется по начальной цене в случаях, предусмотренных законодательством Республики Беларусь, обязан произвести оплату организатору аукциона за его организацию и проведение в размере 4 % от начальной цены предмета торгов и 5 % от суммы превышения цены продажи соответствующего лота над его начальной ценой в белорусских рублях по курсу Национального банка Республики Беларусь, установленному на дату внесения денежных средств.

дополнительно представляется:

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования;

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

**Прием документов** для участия в аукционе начинается с 10.00 10 марта 2009 года и заканчивается в 17.00 30 марта 2009 года.

Торги в отношении каждого земельного участка проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов по каждому выставленному лоту признается участник, предложивший наиболее высокую цену.

Победители торгов (участники аукциона, которым земельные участки предоставляются по начальной цене в случаях, предусмотренных законодательством) обязаны:

в течение 10 рабочих дней со дня принятия Минским горисполкомом решений о предоставлении им соответствующих земельных участков:

- внести плату за предмет аукциона (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения), в белорусских рублях по курсу Национального банка Республики Беларусь, установленному на дату внесения денежных средств;

- возместить Минскому горисполкому расходы по подготовке документации для проведения аукциона;

- выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона;

в сроки, указанные в протоколе о результатах аукциона:

- произвести оплату организатору аукциона за его организацию и проведение, включающую возмещение расходов, связанных с подготовкой и проведением аукциона, в размере 4 % от начальной цены предмета торгов и 5 % от суммы превышения цены продажи соответствующего лота над его начальной ценой в белорусских рублях по курсу Национального банка Республики Беларусь, установленному на дату внесения денежных средств.

После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, Минский горисполком заключает с победителем аукциона (в установленных законодательством случаях – с его участником) договор аренды земельного участка сроком на 5 лет.

Оплата стоимости предметов аукциона осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли по курсу, установленному Национальным банком Республики Беларусь на дату платежа. По заявлению победителя аукциона, Минский горисполком, может предоставить победителю аукциона рассрочку по внесению платы за предмет аукциона в порядке, установленном соответствующей инструкцией, утвержденной решением Мингорисполкома от 05.06.2008 № 1308.

После истечения срока аренды земельного участка (5 лет), предоставленного по результатам аукциона, лицо, которому он предоставлен в установленном порядке обращается в адрес Минского горисполкома с заявлением о продлении срока аренды соответствующего участка (заключении нового договора аренды), на основании которого, по решению исполкома ему предоставляется земельный участок на указанный в заявлении срок, но не более чем на 99 лет, при условии внесения этим лицом платы за право аренды земельного участка, рассчитанной на основании его кадастровой стоимости с применением коэффициентов, установленных Советом Министров Республики Беларусь исходя из сроков аренды земельных участков.

Всем желающим предоставляется возможность ознакомления с землеустроительной и градостроительной документацией по соответствующим земельным участкам, а также приобретения лотовой документации.

В дни и время, указанные в объявлении, размещаемом на информационном стенде (фойе офиса УП «Минский городской центр недвижимости»: г. Минск, ул. К. Маркса, 39), организатором торгов предоставляется транспорт для обеспечения осмотра земельных участков желающими принять участие в аукционе.

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. №№ 4, 6.

**Контактные телефоны + 375 (17) 226 16 72, + 375 (17) 227 40 22.**

**Дополнительная информация о выставленных на аукцион участках, а также условия участия в торгах и бланки требуемых документов размещены на официальном сайте организатора торгов www.mgcn.by.**

# СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



# СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.44 | 17.58 | 11.14 |
| Віцебск — | 6.34 | 17.47 | 11.13 |
| Магілёў — | 6.34 | 17.49 | 11.15 |
| Гомель — | 6.29 | 17.47 | 11.18 |
| Брэст — | 6.59 | 18.14 | 11.15 |
| Гродна — | 6.58 | 18.15 | 11.17 |

**Месяц**

*Першая квадра.*
*Месяц у сузор'і Льва.*

**Імяніны**

**Пр.** *Ірыны, Віктара, Івана, Іосіфа, Леаніда, Міхаіла, Пятра.*
**К.** *Паўла, Тамаша.*



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.




*Віншуем з юбілеем* ***Леаніду Станіслававўну КАРНІЦКУЮ*** *з в. Запольцы Стаўбцоўскага раёна. Жадаем здароўя, шчасця, дабрабыту.*
*Пусть морщинки вас не старят*
*И не трогает беда,*
*Пусть природа вам подарит*
*Жизни долгие года.*

***Сям'я Мішук, в. Літва.***

*Дарагую і любую жонку, маці, цешчу і бабулю* ***Любоў ЕВОДЗІК*** *з вёскі Весялова Навагрудскага раёна віншуем з 60-годдзем.*

*З нагоды гэтай знамянальнай даты жадаем Любові Рыгораўне моцнага сібірскага здароўя, сямейнага шчасця і дабрабыту, доўгіх гадоў жыцця.*

***Родныя, блізкія.***

*Віншуем найлепшую ў свеце матулю* ***Сафію Міхайлаўну ЦІТОВУ*** *з пас. Залог пяцігодкі Пухавіцкага раёна з 70-годдзем і жаночым днём. Жадаем здароўя, доўгіх гадоў жыцця.*

***Сям'я Кебіч.***

# ШТО Ў ІМЕНІ ТАБЕ МАІМ? ТВОРЧАЯ ІДЭЯ!

На хвалі

**Напрыканцы зімы радыё TUT.BY разам з аднайменным парталам абвясцілі своеасаблівае рэаліці-шоу — «Жаночае імя Беларусі». Вынікам яго стане песня-прысвячэнне абранаму імені, якая прагучыць у выкананні Зміцера Вайцюшкевіча на ягоным жа вялікім сольным канцэрце 8 сакавіка. Але праект, які задумваўся як арыгінальны падарунак жанчынам, ледзь не завяршыўся скандалам.**

Сама ідэя абрання «імені-сімвала» не новая і далёка не найгоршая — вядома ж, жанчыны любяць вушамі, таму ім прыемна пачуць колькі добрых словаў ад сабе. Аднак арганізатары праекта аддалі ініцыятыву інтэрнэт-карыстальнікам — пра што вельмі хутка і пашкадавалі. Бо кандыдатамі на «Жаночае імя Беларусі» карыстальнікі назвалі больш за 8 дзясяткаў імёнаў, сярод якіх «класічныя» Рагнеда, Ефрасіння ці Паўліна суседнічалі з экзатычнымі Еўсігініямі, Лаўрамі ці нават Трактарынамі... А падчас галасавання — таксама наладжанага праз інтэрнэт — у лідары выбілася штучнае стварэнне савецкіх часоў — імя Даздраперма («Да здравствует Первое мая!»). Яно было ўнесенае ў спіс ні як бышцам у якасці жарту, але раптам сабрала звыш 25 тысяч галасоў.

Гэту тэндэнцыю, зрэшты, партнёры праекта хутка выявілі, палічылі спробай сапсаваць рамантычную задуму і нават знайшлі канкрэтных інтэрнэт-хуліганаў. «Пасля таго як я звярнулася да спецыялістаў TUT.BY са сваімі сумневамі, яны сапраўды выявілі хакерскую атаку, якая вялася з некалькіх расійскіх IP-адрасоў, — расказвае PR-менеджар аднаго з партнёраў праекта, кампаніі KIA Motors. — Хтосьці напісаў праграму, якая «накручвала» галасы за Даздраперму і Трактарыну. Не тое каб я была супраць гэтага імені, але ўсё ж у Беларусі багатая гісторыя, і ёсць многа прыгожых жаночых імёнаў, з якімі можна звязаць нашу краіну. Таму мы былі вельмі рады, калі ў лідары выйшла імя Дамініка. Хоць яно і мае лацінскае паходжанне (Дамініка з лацінскага — «спадарыня» або «Божы дзень»), яно было досыць распаўсюджанае сярод шляхетных беларускіх паненак, таму мае больш правоў быць прызнаным жаночым імем Беларусі».

...У беларускай гісторыі, шчыра кажучы, наўскідку мы прыгадалі толькі мужчын — уладальнікаў імя Дамінік — ад роду Радзівілаў, Агінскіх да сваякоў Янкі Купалы. А вось сярод сучасніц Дамінік, як высветлілася, сапраўды хапае. Нават на айчыннай эстрадзе іх дзве — ДаМіНіка, крупская школьніца Вераніка Чарняўская, якая колькі гадоў запар актыўна ўдзельнічае ў розных музычных конкурсах (у 2006 годзе, напрыклад, трапіла ў фінал адбору на дзіцячае «Еўрабачанне») і ДамЕніка (насамрэч — Юлія) — былая экс-вакалістка Ірыны Дарафеевай, якая гучна заявіла пра сябе ў сёлетнім адборы на «Еўрабачанне» дарослае. Але для абедзвюх спявачак Дамініка — усяго толькі сцэнічны псеўданім.

...Так ці інакш, сумесны твор Уладзіміра Някляева і Зміцера Вайцюшкевіча «Дамініка» будзе паказаны слухачам 8 сакавіка. Музыкант нават сцвярджае, што ўсе Дамінікі змогуць трапіць на канцэрт бясплатна. А Даздраперма, Трактарына, Сябрына, Параскева, Ярына і нават Лаўрэля, якая набрала ў інтэрнэт-галасаванні менш за ўсё балаў, застануцца для гісторыі. Для носьбітаў іншых імёнаў таксама будуць падрыхтаваны віншаванні з 8 Сакавіка, але, на жаль, не асабістыя прысвячэнні. Тым не менш засмучацца не-Дамінікам не варта, многія жаночыя імёны таксама не абдзеленыя ўвагай з боку беларускіх выканаўцаў.

### За-пя-вай!

Якія яшчэ жаночыя імёны былі апетыя (у прамым сэнсе) беларускімі зоркамі?

«Скажы мне, Ганулька», «Алеся», «Вераніка», «Александрына», «Машанька», «Аэліта», «Лада», «Марыся», «Людка», «Стася» — «Песняры»;

«Алеся», «Элеанора» — ансамбль «Сябры»;

«Стэфка» — гурт «Крама»;

«Ілона», «Асоль» — гурт «Лекі ад меланхоліі»;

«Оленька» і «Вольга» — «Нейра Дзюбель»;

«Ніна», «Прабачце, Маша», «Раінька» — Ляпіс Трубяцкой;

«Мая Маруся», «Ларыса-актрыса» — Аляксей Шэдзько;

«Ева» — гурт «Neo»;

«Маргарыта» — «Беларускія песняры»;

«Пасвіла Кася коні», «Спі, Наталька», «Дарота» і цяпер вось «Дамініка» — Зміцер Вайцюшкевіч.

Ну і практычна кожны прысвячаў песні — а) маме, б) жанчынам, дзяўчатам увогуле — «Беларускія дзяўчаты» («Сябры»), «Дарагія жанчыны!» («Крамбамбуля») і г.д. Не ў імені ж, у рэшце рэшт, справа...

### Жанчыне з якім імем вы прысвяцілі б песню?

**Юлія ГРОМАВА, праваднiца чыгункі:**

— Мне цікава і надзвычай прыемна было б пачуць песню, дзе згадваецца імя Альжбета — так звалі маю прабабулю. Яе, на жаль, з намі ўжо няма, але яна была вельмі светлы і добры чалавек, які навучыў нас з сястрой галоўнаму — ніколі не апускаць рукі. Ну, і прысвячэнне свайму імя таксама спадабалася б! (*Смяецца.*)

**Марат КЛІМАЎ, кандыдат гістарычных навук, навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі Акадэміі навук РБ:**

— Выбраў бы не збіты варыянт — напрыклад, архаічнае імя Ядвіга... Альбо яшчэ Яна, таксама прыгожа гучыць. Нешта вось так у мяне атрымліваецца, напрыклад алфавіта.

**Дамініка ЯРАШ, загадчыца арганізацыйна-метадычным кабінетам Пастаўскай цэнтральнай раённай бальніцы:**

— Ой, так прыемна чуць ад вас, што майму імені будзе прысвечаная песня! Яно ж даволі рэдкае — і ў школе, калі вучылася, была адзіная Дамініка, і ў ВНУ; мабыць, таму што я полька па паходжанні... Ва ўсякім выпадку, сваіх цёзак я ніколі не сустракала. А каму яшчэ прысвяціла б песню? Ну, вось дачка ў мяне — Святлана, было б цікава пра яе песню пачуць. Або пра імя Марыя: у мяне і сястра, і нявестка — Марыі.

**Аляксандр КАБЯК, вадзіцель маршрутнага таксі:**

— Я прысвяціў бы песню мамам — усім без выключэння. За іх цярпенне і мудрасць, за тое, што яны прымаюць нас такімі, якія мы ёсць. Ну, або Тамары — гэта імя маёй маці. Са святам, мама!

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

Усміхнёмся!

# Прыгожыя і хітрыя, або Пра жанчын з усмешкай




**Тэст для мужчын**

Раман з жанчынай мае на мэце толькі адно правіла: зрабі яе шчаслівай. А правілы гульні простыя:

*— робіш тое, што ёй падабаецца — атрымліваеш ачкі;*

*— робіш тое, чаго яна і так чакае ад цябе — нічога не атрымліваеш;*

*— робіш тое, што ёй не падабаецца — губляеш ачкі.*

Твае паўсядзённыя абавязкі:

— Ты прыбраў ложак +1;

— Ты прыбраў ложак, але забыўся пакласці дэкаратыўныя падушкі 0;

— Ты проста накінуў пакрывала на змятыя прасціны -1;

— Ты пакінуў сядзенне ўнітаза паднятым -5;

— Ты ўставіў новы рулон туалетнай паперы 0;

— Калі туалетная папера скончылася, ты проста выставіў сурвэткі Kleenex -1;

— Калі Kleenex скончыўся, ты пачаў карыстацца гасцявым туалетам -2;

— Сярод ночы ты праверыў, што гэта за шум у калідоры 0;

— Сярод ночы ты праверыў, што гэта за шум у калідоры, і там нічога не было 0;

— Сярод ночы ты праверыў, што гэта за шум у калідоры, і там нешта было +5;

— Ты шпурнуў у гэта нешта тапак +10;

— Гэта быў яе сабачка -10;

Выхад у свет. Вечарынка:

— Ты тырчыш побач з ёй увесь вечар 0;

— Ты трохі пастаяў, потым далучыўся да калегі ў бары -2;

— Калегу завуць Таня -4;

— Таня прыгажэйшая за яе -6;

— У Тані большыя грудзі -8;

Яе дзень нараджэння:

— Ты павёў яе ў рэстаран 0;

— Гэта не спорт-бар +1;

— Ну добра, гэта спорт-бар -2;

— І сёння вечар з'ясі-колькі-зможаш-за-10-доляраў -3;

— Плюс да ўсяго гэтага, твой твар размаляваны ў колеры любімай футбольнай каманды -10;

Паход у кінатэатр:

— Ты павёў яе ў кіно +2;

— Ты павёў яе ў кіно, якое яна любіць +4;

— Ты павёў яе ў кіно, якое ты ненавідзіш +6;

— Ты павёў яе ў кіно, якое ты любіш -2;

— Назва фільма «Мёртвы паліцэйскі-9» -3;

— У ім шмат сцэн, дзе кібаргі пажыраюць людзей -9;

— Ты падмануў яе, сказаўшы, што гэта анёльскі фільм пра каханне і дзяцей -15;

Твой знешні выгляд:

— У цябе з'явіўся прыкметны жывоцік -15;

— У цябе з'явіўся прыкметны жывоцік, але ты пачаў змагацца з ім +10;

— У цябе з'явіўся прыкметны жывоцік, і ты перайшоў на прасторныя джынсы і бярмуды -30;

— У цябе з'явіўся прыкметны жывоцік, і пры гэтым ты кажаш: «Ды што там, у цябе такі ж» -800;

Абмеркаванне праблем:

— Ты слухаеш з выразам на твары, які паказвае верагодную цікавасць 0;

— звыш 30 хвілін +5;

— звыш 30 хвілін, пры гэтым ні разу не зірнуўшы ў бок тэлевізара +100;

— Яна нарэшце зразумела, што ты проста заснуў -20;

Вялікае пытанне «Ці выглядаю я тоўстай?»:

— Ты прамаруджыў з адказам -10;

— Ты перапытаў «Дзе?» -35;

— Любы іншы адказ -20.




**Дапаможнік па жаночай логіцы**

**1.** Жанчына заўсёды мае рацыю.
**2.** Калі жанчына не мае рацыі, гл. п. 1.
**3.** Ботаў шмат не бывае.
**4.** Сумак таксама.
**5.** Ніжняй бялізны тым больш.
**6.** Не кажучы ўжо аб касметыцы.
**7.** Жаночая логіка існуе.
**8.** Калі вы думаеце, што яе не існуе, гл. п. 1.
**9.** Футбол — зло.
**10.** Бокс таксама.
**11.** А Каця Пушкарова — зусім не.
**12.** Калі вы не згодныя з п. 9, 10 і 11, гл. п. 1. Дарэчы, тое ж датычыцца і валейбола, баскетбола, рыбалкі, камп'ютарных гульняў, вялікага тэніса, воднага пола, гольфа, пінг-понга, літрбола... стамілася пералічваць.
**13.** Дыяменты — лепшае ўкладанне грошай.
**14.** А нерухомасць — не.
**15.** Нават калі нерухомасць — лепшае ўкладанне грошай, чым дыяменты, гл. п. 1.
**16.** Цэлюліту няма.
**17.** Ёсць толькі сродкі ад цэлюліту.



**18.** На пытанне «Як я выглядаю?» ёсць толькі адзін адказ: «Выдатна, каханая!»
**19.** Мужчына створаны, каб зарабляць грошы.
**20.** А жанчына для таго, каб іх траціць, а таксама ўлагоджваць сваім выглядам мужчыну.
**21.** Я сказала «выглядам». Сэкс тут ні пры чым.
**22.** У краму ходзіць мужчына.
**23.** Таму што ён моцны і разумны.
**24.** А мы прыгожыя і хітрыя.
**25.** Сасіска — сябар чалавека.
**26.** На крайні выпадак, яечня.
**27.** Так, сапраўды, жанчына не чалавек. Яна — Багіня.

**P.S.** Лепшыя сябры дзяўчат... вядома, мужчыны. Пра дыяменты гл. п. 13

**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ**

**Сканворд (3 сакавіка). По гарызанталі:** Аэробіка. Бягун. Эрас. Кватэра. Атака. Радар. Ранг. Лампада. Жмуркі. Атам. Шарнір. Рапіра. Грак. Кус. Карона. Баксіт. Удод. Фаза. Нар. Маштаб. Лотас. Атава. Сож. Крыло. Багна. Азанатар. **Па вертыкалі:** Фехтавальшчык. Плывец. Кумір. Грунт. Народ. Амаці. Анонс. Ракада. Эра. Раскат. "Баядэра". Торг. Рада. Ажына. Круча. Лаз. Саржа. Бамако. Чака. Маруа. Кош. Карт. Ікс. Банка. Руіна. Гімнаст. Баксёр.

**Сканворд (4 сакавіка). Па гарызанталі:** Іерогліф. Шалік. Алах. Кантата. Адэса. Кавун. Кара. Дамкрат. Клапан. Нета. Ландыш. Цырата. Маса. Вар. Атаман. Быліна. Ранг. Кап. Раніца. Амаці. Агата. Руб. Тракт. Сотка. Арматура. **Па вертыкалі:** Снегаход. Луза. Канькі. Камін. Марка. Драма. Нарты. Санкі. Штанга. Акт. Партос. Грамата. Гурт. Лава. Абака. Ілі. Кар. Каханка. Бераст. Лыжы. Дэкан. Лён. Саперáві. Карат. Танец. Анафара. Арэнда.




# ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ЖАНОЧЫЯ САКРЭТЫ

## Вясна: прыгажосць вяртаецца



**Вясна — цудоўная пара, перыяд абуджэння і адраджэння. Мы з нецярплівасцю чакаем яе прыходу і ўсё часцей паглядаем у люстэрка. На жаль, гіпавітаміноз адбіваецца не толькі на стане арганізма, з'яўляецца прычынай стомленасці і дрэннага настрою. Ён адбіваецца і на стане нашых валасоў і скуры, таму і адлюстраванне не заўсёды радуе. Аднак выйсце ёсць: недахоп вітамінаў у арганізме можна зменшыць, калі скарэкціраваць свой рацыён (уключыць у меню паболей садавіны і агародніны), а скуру падсілкаваць пры дапамозе касметычных сродкаў.**

**ВАЛАСЫ**

Пасля пастаяннага нашэння шапак валасы губляюць першапачатковы бляск і прыгажосць, таму яны маюць патрэбу ў старанным доглядзе. Каб аднавіць іх яркасць і пазбавіцца ад сухіх кончыкаў, не абавязкова бегчы ў дарагі салон. Прапануем некалькі сакрэтаў, якія дапамогуць вярнуць валасам прыгажосць.

● У першую чаргу слабыя валасы трэба падтрымаць знутры. Купіце спецыяльныя вітамінна-мінеральныя комплексы, якія змяшчаюць вітаміны А і вітаміны групы В. Карысна для валасоў і спалучэнне вітамінаў А + Е.

● Пасля мыцця галавы карысна апаласкваць валасы настоямі з розных раслін. Напрыклад, экстракты мяты ці крапівы змякчаюць і стымулююць рост валасоў.

● Незаменнай «падкормкай» з'яўляюцца розныя маскі. Рэцэпты іх вельмі простыя, таму прыгатаваць іх можна ў хатніх умовах.

**Маска для ўмацавання валасоў:** Натаркуйце рэдзьку, адцісніце сок і ўватрыце ў карані валасоў. Абкруціце галаву ручніком, пакіньце на адну гадзіну. Затым старанна прамыйце валасы цёплай вадой.

**Маска для лепшага росту валасоў.** Змяшайце яечны жаўток і сталовую лыжку гарэлкі. Састаў уватрыце ў скуру галавы. Праз 40 хвілін прамыйце вадой. Такі спосаб выдатна дапамагае і пры выпадзенні валасоў.

**ХУТКАЯ ДАПАМОГА ДЛЯ ТВАРУ**

Догляд твару, асабліва пасля зімы з яе перападамі тэмператур, вятрамі і маразамі, трымаецца на трох кітах: ачышчэнне, танізаванне і сілкаванне. За зіму скура згубіла шмат вільгаці, таму паспрабуйце яе максімальна ўвільгатніць. Лепш за ўсё гэта зрабіць пры дапамозе ледзяных кубікаў, якія можна замарозіць з настояў рамонку, шалфею, пятрушкі.

Калі вы прачнуліся і ўбачылі пад вачыма ацёкі, не панікуйце — вас выратуе сырая бульба. Натаркуйце адну сярэднюю бульбіну, пакладзіце на марлю і прыкладзіце да павекаў на 15 хвілін. Каб надаць скуры эластычнасць і пругкасць, падсілкуйце яе таксама маскамі

● Змяшайце 1 жаўток з паловай чайнай лыжкі мёду, дадайце чайную лыжку аліўкавага алею, 0,5 чайнай лыжкі соку лімона і няпоўную лыжку здраблёнага геркулесу. Добра перамяшайце, нанясіце на твар на 15 хвілін, пасля чаго змыйце халаднаватай вадой.

● Сталовую лыжку свежых дрожджэй разатрыце ў невялікай колькасці свежага малака, атрыманую масу нанясіце на твар. Дайце падсохнуць, затым змыйце халаднаватай вадой. Пры сухой скуры ў гэту маску можна дадаць 5 кропель аліўкавага алею.

**ШЫЯ**

Гэта самае праблемнае месца ў жанчын. Догляд яе ўключае падтрымку прыгожай, роўнай паставы, кампрэсы і масаж.

Вось рэцэпт, якім карысталіся яшчэ прыгажуні Старажытнага Рыма: 200 г лаўровага лісту заліце 100 мл вады, давядзіце да кіпення. Зніміце з агню, дайце настаяцца, працадзіце. Гэтым ласьёнам працірайце шыю кожны дзень зранку і ўвечары. Ён выдатна асвятляе скуру, робіць далікатнай і папярэджвае ўтварэнне зморшчын.

-2557-

ПАДКАЗКІ ДАСВЕДЧАНЫХ

## Сумкі розныя патрэбны

**Многія жанчыны мараць мець у гардэробе шмат сумак. У ідэале — да кожнага ўбору сваю. Але гэта ў марах. А што атрымліваецца ў жыцці?**

Калі сур'ёзна задумацца, то адказ напрошваецца такі: дастаткова двух-трох сумак. Адну трэба мець для працы, другую для прагулак і паходаў па крамах і яшчэ адну для вячэрніх мерапрыемстваў ці візітаў у госці. Галоўнае, каб кожная з іх была тое, што трэба — пасавала і адпавядала менавіта вам.

**Выбар сумкі — справа сур'ёзная**

На жаль, часта адбываецца так: вы купілі сумку, а праз пэўны час зразумелі, што яна зусім не такая, пра якую марылі. Каб пазбегнуць падобных расчараванняў і набыць сапраўдную «баявую сяброўку», да выбару новай сумкі трэба падысці з усёй адказнасцю, бо яна павінна будзе не толькі суправаджаць вас усюды і з годнасцю вытрымліваць нагрузкі вашага працоўнага дня, але і гаварыць усім пра густ сваёй гаспадыні.

**Правіла 1.** Перш за ўсё неабходна памятаць, што сумка — гэта дапаўненне да вашага адзення. Калі яна супярэчыць асноўнаму стылю, ад такой сумкі лепш адмовіцца, як бы яна вам ні падабалася. Або давядзецца змяніць дзеля яе гардэроб. Магчыма, раптоўная прыхільнасць да авангарднай сумкі сведчыць аб тым, што час гэта зрабіць. Памятайце толькі, што незвычайныя дэталі (напрыклад, саломка, аксаміт, яркая тканіна і інш.) могуць ужо праз паўгода выйсці з моды.

**Правіла 2.** Калі вы шукаеце сумку «на стагоддзі», спыніце свой выбар на класічным крoі і «стандартным» колеры — чорным ці карычневым, а для лета — бэжавым ці белым. Аднак не перастарайцеся ў імкненні прытрымлівацца стылю. Класічны — не значыць нудлівы.

**Правіла 3.** Пасля стылю, звярніце ўвагу на памер. Сёння ў модзе даволі аб'ёмныя сумкі. Бо нават у тэатральную сумачку павінны ўмясціцца хоць бы тэлефон, кашалёк, невялікая касметычка, а ў дзелавую яшчэ і штодзённік, паперы, мноства іншых неабходных рэчаў.

**Правіла 4.** Выбіраючы вялікую сумку, ацаніце яе вагу. Буйная фурнітура, якая патрабуецца вялікай сумцы, на жаль, дадаткова ўцяжарвае выраб. У краме ўзважце сумку ў руках, пахадзіце па зале, павесьце яе на плячо. Калі нават пустую сумку вы адчуваеце як нешта значнае, то насіць у ёй неабходныя рэчы будзе няпроста.

**Сучасныя тэндэнцыі**



● Разнастайнасць сучасных мадэляў проста ўражвае: круглыя, прамавугольныя, квадратныя, вялікія і маленькія, у выглядзе торбы ці планшэта, у спартыўным і рамантычным стылі. Агульная тэндэнцыя — функцыянальнасць. Сёння можна падабраць умяшчальную супермодную сумачку, у якой не пакамячацца важныя паперы, знойдзецца аддзяленне для тэлефона і ручкі, для набору касметыкі і нават... адвёрткі. Напрыклад — дамскі партфель.

● Разумеючы, што нельга ўвесь час прытрымлівацца строгага рабочага рытму і стылю, дызайнеры вяртаюцца да рэтра з замілавальна-ўтульнымі дэталямі. У модзе габелен, старая клятчатка, шырокія доўгія рамяні, састарэлая скура. У якасці аздаблення выкарыстоўваюцца ланцужкі, махры, атласныя стужкі, спражкі, кручкі.

● Правіла, якое сцвярджае, што сумка па колеры павінны быць у гармоніі з абуткам, капялюшыкам і пальчаткамі, у нашы дні не актуальнае. Сёння вы можаце падабраць сумку да любой дэталі адзення: шаліка, хусцінкі, спадніцы. Не варта толькі набываць сумку аднаго колеру з паліто ці курткай — колеры зліюцца, і сумка застанецца непрыкметнай.

-2558-

Дзве даты

## 7 сакавіка

**1886 год** — нарадзіўся Усевалад Сцяпанавіч Фальскі, беларускі грамадска-палітычны, дзяржаўны і культурны дзеяч, акцёр, адзін са стваральнікаў беларускага прафесійнага тэатра. Удзельнічаў у арганізацыі і быў старшынёй Першага таварыства беларускай драмы і камедыі, Мінскага таварыства работнікаў мастацтва. У 1919 годзе займаў пасаду камісара замежных спраў Часовага рабоча-сялянскага ўрада Беларусі.



**1960 год** — створаны першы атрад савецкіх касманаўтаў з 18 чалавек.

Цытата дня:

*«Людзі, якім заўсёды не хапае часу, звычайна нічога не робяць».*

**Георг Крыстаф Ліхтэнберг (1742—1799), нямецкі вучоны і пісьменнік.**

# НАСЕННЕ

Свет і сусвет чалавека

**Да насення заўсёды ставіліся як да сімвала ўрадлівасці, будучыні, працягу жыцця. Добрыя гаспадары ведалі законы аграноміі і бездакорна іх выконвалі.**

● Зерне, нарыхтаванае на насенне, захоўвалі так, каб ніхто не змог узяць з яго нават жмені.

● Акрамя таго, ведаі, што з зерня, якое захоўвалі на засеўкі, нельга пячы хлеб, прадаваць ці пазычаць яго камусьці.

● Сухое зерне лепей пераносіць восеньскія і зімовыя маразы.

● Насенне трэба адмяраць «з верхам», тады і расці будзе «з вехам».

● Пры продажы зерня гаспадар абавязкова адсыпаў у пусты засек тры жмені, каб у яго гаспадарцы насенне ніколі не зводзілася.

● Мяхі з насеннем не зашывалі, а завязвалі, каб «не зашыць» прарастанне насення ў зямлі, і каб колас добра «завязваўся».

● Дзяўчатам і жанчынам катэгарычна забаранялася сядаць на мяхі з насеннем.

● Калі насенне аказалася дрэнным, няўродным, лічылася, што жменя ўкрадзенага ўраджайнага зерня верне няўроднаму моц і дасць добры ўраджай.

● Існавала жорсткая забарона перасыпаць рэшткі насення з меха ў мех. Лічылася, што ў такім выпадку на хлеб будзе няўрод: «толькі з мяшка ў мяшок зерне пераганіш».

● Той, хто сеяў зерне, не перасыпаў яго з рукі ў руку — прыкмета да няўроду. Нельга хлеб «ганяць» задарма.

● Таксама нельга было сеяць на адным полі старое і новае насенне.

● Калі з намалочанага хлеба зрабіць дзе-небудзь у гумне ці асеці кавалак страхі, гаспадарка заўжды будзе мець хлеб.

● Каб у жыце не было так званых «ражкоў», з насення пасля веяння не трэба збіраць каласкоў.

● Сеючы поле, прытрымліваліся пэўнага часу, умоў надвор'я, мясцовага клімату.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 47 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 33.538 Індэкс 63850. Зак. № 1243. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12